ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАЯ ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ЗАСНАВАНА Ў 1920 г.

ПАГОНЯ №100

6 – 12 студзеня 1995г. (№ 1) Кошт 100 рублёў



КАЛОНКА РЭДАКТАРА

НЕ РАЗЬБІЦЬ, НЕ СПЫНІЦЬ, НЕ СТРЫМАЦЬ!

Паважаныя чытачы! Сёньня Вы трымаеце ў руках юбілейны - соты нумар "ПАГОНІ". Сто тыдняў запар, нягледзячы ні на якія перашкоды, "Пагоня" прабівалася да Вас, несучы на сваіх старонках словы праўды.

Сто тыдняў... Мы многае перажылі разам з Вамі за гэты час. Пасталелі, вырасьлі... Больш чым у 10 разоў павялічыўся за гэты тэрмін наклад газеты! Па выніках падпісной кампаніі мы падвоілі лік сваіх падпісчыкаў. Агульны лік сталых сяброў "Пагоні" складае цяпер амаль 1600 чалавек. 100 тыдняў назад не было ніводнага, як не было і самой "Пагоні".

Сто тыдняў... Кожны з іх стаўся суровым выпрабаваньнем на жыцьцяздольнасьць для незалежнага беларускага друку. Тым не менш, "Пагоня" не згубілася ў моры шматлікіх праблемаў, якія штучна ствараліся вакол вольнага слова то Кебічам з ягонай хеўрай, то Лукашэнкам з ягонымі "прагматыкамі". Патугі аматараў "трымаць і не пушчаць" нязьменна разьбіваліся дзякуючы велізарнай арганізацыйнай, маральнай і фінансавай падтрымцы нашых сяброў і прыхільнікаў, Вас, нашыя паважаныя сябры! І таму мы віншуем Вас усіх з гэтым юбілеем!

Вельмі сімвалічна, што ён супаў са сьветлым сьвятам Нараджэньня Хрыстовага. У гэтыя дні, калі Сын Божы прыйшоў у сьвет дзеля нашага збаўленьня, "Пагоня" працягвае свой няўрымсьлівы бег да душаў і сэрцаў людзкіх. Такое супадзеньне нас да многага абавязвае. І найперш да таго, каб не толькі у гэтыя сьвятыя дні, але і ў кожны дзень абуджаць самыя лепшыя, самыя ўзвышаныя пачуцьці, супрацьстаяць сілам Цемры, што пануюць сёньня на Беларусі. Толькі тады наша жыцьцё набудзе сапраўдны сэнс, усталюецца на непарушным грунце, будзе годным нашага чалавечага і хрысьціянскага званьня.

Няхай Новы год прынясе ў нашу сям'ю шчасьце і згоду! Няхай дасьць нам Збавіцель сілы і моцы! Не пакідайма адзін аднаго і надалей! Жыве "Пагоня"! Жыве Беларусь!

Мікола МАРКЕВІЧ.

АД РЭДАКЦЫІ: Запрашаем усіх сяброў газеты на вечарыну, прысьвечаную выхаду юбілейнага сотага нумара "Пагоні". Яна адбудзецца 6 студзеня у Гарадзенскім тэатры лялек. Пачатак а 19-ай гадзіне. Уваход вольны.

ВІНШАВАНЬНІ

Рэдакцыя газеты "Свабода" віншуе сваіх калег з "Пагоні" з выхадам 100-га нумара іхняга штотыднёвіка.

Газеты з падобнай назвай выходзілі ў розныя часы ў розных гарадах і нават краінах. Таму гістарычна "Пагоні" наканавана доўгае жыцьцё.

Жыве Беларусь!

Паважаныя калегі!

У сувязі з Вашым сьціплым сьвятам - выданьнем сотага нумара ўзноўленай "Пагоні" - мы шчыра ўдзячны выпадку адзначыць, што калектыў газеты шукае сваё месца ў дэмакратычнай плыні сучаснай беларускай журналістыкі. Гэтая накіраванасьць заўважана і заслужана ацэнена грамадзкасьцю Гарадзеншчыны, рэспублікі, бліжняга і дальняга замежжа, што відаць па ўпэўненаму росту наклада і аўтарскага актыва.

Сёньня газетам надзвычай цяжка, асабліва нацыянальным, і тройчы - тым, якія адлюстроўваюць рэчаіснасьць, не афарбаваную колерам улады.

Спадзяемся, што і надалей "Пагоня" будзе служыць справе адраджэньня, незалежнасьці і суверэнітэта нашай краіны.

Жыве Беларусь!

Калектыў рэдакцыі газеты "ВЫСОТА".

Рэдакцыя газеты "Большая Медведица" віншуе сваіх калег са сьвятам - выхадам першага трохзначнага нумара.

Жадаем посьпехаў у пагоні за славутасьцю, ўдзячнасьцю чытача, а таксама цікавых матэрыялаў.

Маем надзею на плённае супрацоўніцтва.

Рэдакцыйны калектыў газеты "БОЛЬШАЯ МЕДВЕДИЦА".

Шаноўная рэдакцыя!

Аўтарытэт газеты для нашага Гарадзенскага дэмакратычнага аб'яднаньня ветэранаў пацьвярджаецца тым, што амаль кожны сябра нашай арганізацыі зьяўляецца падпісчыкам "Пагоні".

Жадаем і далей бачыць на старонках газеты праўдзівую, дасканалую, аператыўную інфармацыю, а таксама грунтоўныя артыкулы па дасьледаваньню гісторыі Бацькаўшчыны.

Рада праўленьня ДАВ.

Паважаная рэдакцыя газеты "Пагоня"!

Як сталы чытач з першага да 99-га нумара вашай газеты віншую рэдакцыю. Шаноўная адзіная беларускамоўная, праўдзівая, дэмакратычная газета, са сьвятам 100-га нумара.!

Хацелася б, каб газета "Пагоня" была невычарпальнай, чыстай крыніцай Беларушчыны, нацыянальнага і эканамічнага "Адраджэньня".

Шаную і шчыра кланяюся.

Кастусь ЖЫНЬ, Сябра Сойму БНФ "Адраджэньне".

Паважаныя "Пагонеўцы"!

Дзякую Вам за тое, што ў гэты цяжкі для Беларусі час Вы не даеце згубіць надзею на тое, што "загляне сонца і ў наша ваконца", за тое, што, чытаючы "Пагоню", пачынаеш верыць, што і ў нас будзе сапраўдная дзяржава і сапраўдны Прэзідэнт, што ёсьць яшчэ людзі, якія не дадуць крыўдзіць нашу мову.

Віншую Вас з Новым годам, з Калядамі і са сьвяточным 100-ым выпускам "Пагоні", жадаю здароўя, шчасьця, дабрабыту і посьпехаў у Вашай нялёгкай, але пачэснай працы.

Ваш чытач М.БЕЛАКОЗ.

Я люблю "Пагоню"

за аператыўнасьць, праўду, своечасовасьць, сьмелыя артыкулы аўтараў і пазаштатных карэспандэнтаў - гэта тое, што розьніць "Пагоню" ад іншых сродкаў "Мас-Медыя".


А.БАШКО.

АХВОТНІКАЎ, СІМПАТЫКАЎ І ПАТРЫЁТАЎ БЕЛАРУШЧЫНЫ ЗАПРАШАЕМ ВОСЬМАГА СТУДЗЕНЯ Ў 14.30 ДА СШ N 26 АДСЬВЯТКАВАЦЬ КАЛЯДНЫЯ СЬВЯТЫ РАЗАМ З НАМІ.

Аргкамітэт.

ПАЛІТЫЧНАЯ СЦЭНА

СВАБОДА, РОЎНАСЬЦЬ, САЛІДАРНАСЬЦЬ



Беларуская Сацыял-Дэмакратычная грамада (БСДГ) заснавана ў сакавіку 1991 года. Папярэднікамі БСДГ былі Беларуская Сацыялістычная Грамада (1903-1918 г.г.) і Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (1918-1924 г.г.). Заслугай беларускіх сацыялістаў зьяўляецца абвяшчэньне Беларускай Народнай Рэспублікі 25 сакавіка 1918 г.

Першым старшынёй Цэнтральнай Рады БСДГ быў вядомы беларускі вучоны і палітык Міхась Ткачоў. Яго пераемнікам на гэтай пасадзе стаў народны дэпутат Беларусі Алег Трусаў. Дэпутацкая фракцыя Грамады ў Вярхоўным Савеце налічвае 12 чалавек. Сярод іх Віктар Алампіеў, Мікалай Крыжаноўскі, Анатоль Вярцінскі, Віктар Какоўка, Яўген Цумараў, Леанід Дзейка і інш. Сацыял-дэмакраты ёсьць сярод дэпутатаў абласных, раённых, гарадзкіх і сельскіх Саветаў. Анатоль Гурыновіч, намесьнік старшыні Мінгарсавета, і старшыня патрыятычнага руху "Беларускае згуртаваньне вайскоўцаў" Мікалай Статкевіч зьяўляюцца сябрамі Цэнтральнай Рады БСДГ. Арганізацыі БСДГ дзейнічаюць ва ўсіх абласных і большасьці раённых гарадоў рэспублікі. Колькасьць сяброў Грамады дасягае 1500 чалавек. У шэрагах партыі шмат інжэнераў і тэхнікаў, выкладчыкаў і настаўнікаў, кваліфікаваных рабочых і прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі, людзей з вучонымі ступенямі кандыдатаў і дактароў навук. Партыя сацыял-дэмакратаў у сучасны перыяд выконвае тры функцыі: ліберальную, уласна сацыял-дэмакратычную і патрыятычную. Ліберальная функцыя Грамады заключаецца ў тым, што мы актыўна выступаем за радыкальнае рэфармаваньне эканамічнага жыцьця рэспублікі. Як сацыял-дэмакраты, мы, безумоўна, выказваемся за абарону правоў і жыцьцёвыя інтарэсы чалавека працы. Патрыятычная функцыя Грамады ў тым, што мы баронім суверэнныя правы народа Беларусі, Беларускай дзяржавы, яе незалежнасьць.

НАШЫ ПРЫНЦЫПЫ - СВАБОДА, РОЎНАСЬЦЬ, САЛІДАРНАСЬЦЬ.

СВАБОДУ мы разумеем як права чалавека быць вольным у вызначэньні свайго лёсу, вольным у выбары, вольным ад палітычнага, адміністрацыйнага прымусу. СВАБОДУ як павагу да думкі і правоў меншасьці - нацыянальнай, сацыяльнай, палітычнай, рэлігійнай.

РОЎНАСЬЦЬ мы разумеем як раўнацэннасьць усіх людзей, як перадумову свабоды і свабоднага разьвіцьця чалавека.

САЛІДАРНАСЬЦЬ мы разумеем як выяўленьне ўзаемасувязей людзей, як асноўную ўмову выжываньня чалавечага роду. Спагада, спачуваньне, узаемная павага складаюць аснову САЛІДАРНАСЬЦІ.

БЛІЖЭЙШЫЯ ЗАДАЧЫ - актыўны ўдзел у выбарах новага Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь з мэтай:

- адхіленьня ад улады пракамуністычнай наменклатурнай праслойкі;
- правядзеньня радыкальных эканамічных рэформ, фарміраваньня шматукладнай рыначнай эканомікі;
- жорсткай барацьбы са злачыннасьцю, выкараненьня карупцыі;
- сацыяльнай абароны людзей наёмнай працы пры асаблівай увазе да пеньсіянераў, хворых, інвалідаў, дзяцей і моладзі.


Партыя выдае свой штомесячны бюлетэнь "Навіны Грамады".

Нашы адрасы і тэлефоны.

Штаб-кватэра Грамады: 220026, Менск, Партызанскі пр-т, д.83, кв.53. Тэл. 46-46-91, факс 45-78-52.

Для лістоў: 220026, Менск, а/с 129.

Арганізацыі: Горадня - 33-67-06, 5-26-05, факс 31-78-94; г.Пінск - 5-65-63, г.Віцебск - 5-95-47, г.Гомель - 56-72-33, г.Берасьце - 3-98-88; г.Жлобін - 2-44-65; г.Магілёў - 22-45-88, 22-33-88, 23-52-00; г.Баранавічы - 5-64-60, факс 2-31-39; г.Маладзечна - 6-08-84.



ЗАЯВА

выканкама Цэнтральнай рады Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады

22 сьнежня 1994 года газета "Советская Белоруссия" выйшла з белымі плямамі на дзьвюх старонках. На наступны дзень у такім выглядзе выйшлі газеты "Звязда" і "Рэспубліка". На гэтым месцы вышэйзгаданыя газеты меліся зьмясьціць пераказ даклада дэпутата Сяргея Антончыка, у якім парламентарый выкрываў факты карупцыі ў бліжэйшым атачэньні прэзідэнта А.Лукашэнкі. Карыстаючыся тым, што друкарня падпарадкавана апарату прэзідэнта, людзі з акружэньня Лукашэнкі забаранілі друкаваць пераказ даклада Антончыка.

Рэдакцыі "Советской Белоруссии", "Звязды" і "Рэспублікі" вымушаны былі выпусьціць свае нумары з белымі плямамі. Такім чынам, у Беларусі адноўлена цэнзура. Грамадзяне абмяжоўваюцца ў праве шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю. Пратэстуючы супраць дзеяньняў прэзідэнцкага апарату, выканкам Цэнтральнай рады БСДГ канстатуе, што афіцыйныя асобы краіны парушаюць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь і нормы міжнародных актаў, якія падпісала і ратыфікавала наша дзяржава. Выканкам грамады лічыць патрэбным паведаміць аб парушэньні правоў чалавека ў Беларусі ўсім партыям сацыялістычнага Інтэрнацыяналу сьвету.

За апошнія два гады тры разы праводзілася ў Камітэце дзяржтэлерадыё так званая рэарганізацыя. Як вядома, у 1992 годзе пры такім пераўтварэньні пачаўся разгон дэмакратычна настроеных журналістаў, ліквідацыя такіх папулярных інфармацыйных праграм, як "Ніка". Праўда, поўнасьцю тады яе не прыкрылі, а звольнілі рэдактараў Бабкіну і Іванову. Напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў урад Кебіча рэарганізаваў Нацыянальную тэлерадыёкампанію у Камітэт дзяржтэлерадыё, дзе таксама разьвязаны разгон журналістаў і ліквідацыя папулярнай радыёстанцыі "Беларуская маладзёжная". Не прайшло і паўгады, як была аб'яўлена наступная рэарганізацыя, цяпер ужо па ўказу прэзідэнта. І зноў прадстаўляецца магчымасьць пазбавіцца ад непажаданых для ўлад перадач і журналістаў. На гэты раз арганізатараў і стваральнікаў "Нікі" разагналі поўнасьцю. Звольнены адзін з актыўных яе рэдактараў Мікалай Сальмакоў, які 16 год працаваў у гэтай структуры. Паралізавана работа вядомых журналістаў, такіх, напрыклад, як Ганны Рацішкевіч, якія выведзены з рэдакцыі грамадзка-сацыяльных эканамічных праграм.

Выканкам Грамады рашуча пратэстуе і патрабуе аднаўленьня на рабоце старшага рэдактара інфармацыйных праграм Мікалая Сальмакова, накіроўвае гэты зварот Генеральнаму пракурору Васілю Шаладонаву і просіць ў якасьці пракурорскага нагляду праверыць законнасьць гэтага звальненьня. Паўстае пытаньне: ці не выкарыстоўваюцца такія арганізацыі для ганеньня дэмакратычна настроеных журналістаў?

ЗВАРОТ ДА ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АД ЖЫХАРОЎ Г.ГОРАДНІ

Мы, жыхары нашай роднай краіны Беларусь, зьвяртаемся да Прэзідэнта Беларусі з запытам: колькі разоў будуць пэўныя сілы мяняць Канстытуцыю і дабаўляць папраўкі да яе?

Бальшавікі мянялі Канстытуцыю некалькі разоў так, як ім хацелася, як ім было выгадна - народ быў у змане, і Савецкі Саюз мусіў разваліцца. Чаму? Таму што інтарэсы народа ніхто не абараняў. Наадварот, інтарэсамі народа злоўжывалі прайдзісьветы ад ЦК КПСС.

Даведаўшыся пра падпісаньне пастановы М.Грыба да Прэзідыума Вярхоўнага Савета аб стварэньні камісіі па пытаньнях дзяржаўнай сімволікі, мы, сумленныя жыхары Беларусі, не можам маўчаць, калі зьневажаюць дзяржаўны герб, сьцяг. Таму што настаў другі час - народ цяпер патрабуе шанаваць наш герб, сьцяг, дзяржаўную мову. Трэба даць адпор розным чырвона-карычневым сілам, якія, як наросты на жывым целе, паратызуюць на нашым сумленьні, а наўзамен прапануюць нам то "рублёвую зону", то "дзьвюхмоўе".

Спадар Прэзідэнт!

Мы патрабуем выконваць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, каб і з Вашых вуснаў не зьневажаўся герб, сьцяг, дзяржаўная мова і каб была дадзена свабода сродкам масавай інфармацыі, а пэўным антынародным сілам (тыпу "Славянскі Сабор", ЛДП, Саюз афіцэраў і інш.) была дадзена Вамі за іх антыдзяржаўную дзейнасьць адпаведная адзнака.

Толькі беларуская мова, толькі наш герб "Пагоня", толькі наш бел-чырвона-белы сьцяг!

Жыве Беларусь!

Падпісаліся больш за 200 чалавек.

ГАЛОЎНАЕ ПРАВІЛА САПРАЎДНАГА ПРЭЗІДЭНТА

Адкрыты ліст прэзідэнту Беларусі па моўнай праблеме

Паважаны прэзідэнт А.Р.Лукашэнка!

Мяне вельмі непакояць некаторыя вашы выказваньні пра беларускую мову (напрыклад, у Менскім педагагічным універсітэце, у Акадэміі навук Беларусі, пры зацьвярджэньні Гомельскім абласным Саветам вашага прадстаўніка па гэтай вобласьці). Іх сутнасьць можна выказаць так: беларускай дзяржаўнай мове не месца ў навуцы і вышэйшай адукацыі - бо яна, на вашу думку (у адрозьненьні ад расейскай і ангельскай моў), недастаткова вялікая.

Дазвольце тады адразу запытацца. А дзе яе месца (як, дарэчы, нямецкай, французскай, гішпанскай, арабскай, кітайскай ды ўсіх астатніх моў)? У кароўніках ды сьвінарніках? Дык вы ж першы скажаце, што не. Што я не так вас зразумеў.

Паколькі я не маю магчымасьці паразмаўляць з вамі асабіста, успрыміце мае далейшыя развaжаньні на тэму мовы па магчымасьці спакойна, праз розум. Яны - вынік шчырага жаданьня дапамагчы вам не дапускаць далейшых палітычных памылак, жаданьня ўстрымаць вас ад нанясеньня шкоды нашаму беларускаму народу.

Паколькі мне нічога не вядома аб сапраўдных прычынах вашых паводзін, дазвольце разгледзець дзьве сітуацыі. У адпаведнасьці з першай з іх вашы выказваньні зьяўляюцца вынікам простага няведаньня фактаў, шчырай памылковасьці меркаваньняў (я, дарэчы, вельмі спадзяюся, што гэта найбольш верагодны варыянт). Тады паўбяды, і становішча можна хутка паправіць. Я зараз жа, на грамадзкіх пачатках (у адрозьненьні ад шаптуноў вакол вас) паспрабую вас пераканаць. Калі ж вашыя словы - гэта праява сьвядомай палітыкі "прэзідэнта Беларусі", тады гэта зусім іншая сітуацыя, тады размова будзе мець і іншы кшталт.

Ітак, дапусьцім, што вы проста яшчэ многага не ведаеце і таму робіце памылкі ў сваіх зьняважлівых адносінах да роднага слова. Паспрабуйце для пачатку перакласьці на "великий и могучий" тыя значэньні, якія нясуць хаця б наступныя пары беларускіх слоў: "любоў і каханьне", "густ і смак", "позірк і погляд". Вы абавязкова пераканаецеся, што "могучесть" расейскай мовы нярэдка перабольшваецца? Магчыма, зараз вы па-новаму асэнсуеце і словы Адама Міцкевіча, які яшчэ паўтара стагоддзя назад гаварыў пра беларускую мову як пра самую распрацаваную сярод усіх славянскіх моў (пра іншыя яе каштоўныя характарыстыкі я ўжо не ўзгадваю).

Што датычыць высокай ацэнкі вамі ангельскай мовы, дык я спадзяюся, што ўжо ў хуткім часе вы забясьпечыце жыхарам Беларусі самыя шырокія магчымасьці для авалодваньня ёю. Між іншым, нагадаю, што да гэтага часу вынікoвае навучаньне ангельскай мовы ў большасьці нашых школ фактычна адсутнічае. Зроблена так яшчэ ў былым СССР і не выпадкова, а для таго, каб яшчэ больш утрымліваць яго жыхароў ад жаданьня зьехаць за мяжу. Зараз мы сталі адкрытымі. Таму, падтрымліваючы ваша жаданьне, каб насельніцтва Беларусі авалодала галоўнай мовай міжнародных зносін, я прапаную ў якасьці першага кроку зрабіць так, каб тэлевізары жыхароў Беларусі прымалі па 2-, 3-х каналах замежныя ангельскамоўныя праграмы (лепш без перакладу). Паралельна можна пачаць папраўляць сьветапогляд многіх нашых грамадзян, скасабочаны ва ўсходнім накірунку з-за адпаведнай інфармацыйнай палітыкі папярэдніх кіраўнікоў. Я маю на ўвазе тое, што большасьць насельніцтва суверэннай Беларусі (краіны, між іншым, у цэнтры Эўропы, а Эўропа - пакуль што цэнтр міравой цывілізацыі), да гэтага часу могуць глядзець перадачы толькі па 4-ох тэлевізійных каналах, з якіх аж тры - расейскія (?!).

Але ж, у прынцыпе, я вам шчыра прапаную пакінуць у спакоі лаўры вядомага "мовазнаўцы і сябра ўсіх народаў і больш ніколі не выказвацца з ацэнкамі той ці іншай мовы, бо гэта не адпавядае ні профілю вашай адукацыі, ні ўзроўню вашай адукаванасьці.

Паважаны прэзідэнт. Будзем лічыць, што вам нехта ўвёў у вушы памылковую думку, быццам бы беларускай мовай зараз карыстаюцца толькі тыя, хто павінен ёй карыстацца па роду сваёй прафесійнай дзейнасьці. З гэтай нагоды інфармую вас, што ўсё выглядае зусім не так. Ужо зараз вельмі многія, хто па прафесіі зьяўляецца эканамістамі, урачамі, фізікамі, юрыстамі, інжынерамі ці проста рабочымі ды сялянамі, вярнуліся да роднай мовы. Такіх людзей асабліва многа ў асяроддзі прыхільнікаў нацыянальнага адраджэньня, прычым яны размаўляюць па-беларуску, як правіла, не з-за якіх-небудзь спецыяльных нацыяналістычных поглядаў, а проста з-за таго, што ўжо зараз лічаць няведаньне беларускай мовы праявай элементарнай культурнай недаразьвітасьці - тым, чаго яны сабе даравaць не могуць.

Больш таго, усё часьцей можна заўважыць, напрыклад, у Горадні звыклых людзей, далёкіх ад якой-небудзь палітыкі, якія не толькі свабодна размаўляць па-беларуску, але і робяць гэта з нейкай ганарцой. Справа ў тым, што ўсе гэтыя людзі проста паступова перастаюць саромецца сваёй мовы. Адбываецца гэта, у прыватнасьці, з-за таго, што за апошнія гады яны бачаць і чуюць многіх паважаных імі людзей (у тым ліку на дзяржаўных пасадах), якія свабодна, не адчуваючы ніякіх комплексаў, гавораць па-беларуску. Шкада, што да гэтых людзей пакуль што нельга аднесьці вас.

Паважаны прэзідэнт. Калі ўсе прыведзеныя вышэй аргументы вас не пераканалі, зьвярніце ўвагу хаця б на тое, што не толькі вам, але, відаць, нікому не вядомы прыклады, калі кіраўнік якой-небудзь дзяржавы (я не кажу нават пра Нямеччыну, Італію, Гішпанію, Францыю ці Швецыю, а пра акаляючыя Беларусь краіны - Украіну, Польшчу, Летуву, Латвію, Эстонію, Расею) дапускаў адносна мовы яе карэннага насельніцтва выказваньні, маючыя сэнс, блізкі да вашага. Сама ўнікальнасьць сітуацыі павінна быць для вас доказам таго, што вы гаворыце нешта не тое, нешта, што выходзіць за рамкі нармальных паводзін дзяржаўнага дзеяча.

Давайце паспрабуем разабрацца, чым можна растлумачыць узгаданыя вышэй паводзіны кіраўнікоў названых і не названых краін.

Вось вы любіце называць сябе народным прэзідэнтам з-за таго, што за вас у другім туры прагаласавала большасьць тых, хто меў права да галасаваньня (каля 56% выбаршчыкаў - 70%-80%). Але ж вы не станеце адмаўляць, што многія галасавалі не столькі за вас, колькі супраць Кебіча, бо менавіта вы найбольш заўзята абяцалі разабрацца з ім і 70 чыноўнікамі яго акружэньня. Зараз, па меры таго, як вы не выконваеце гэтае і многія іншыя свае абяцаньні (будзем лічыць, што для гэтага ёсьць нейкія сур'ёзныя абставіны), колькасьць падтрымліваючых вас людзей значна зьменшылася. Вось тут я хацеў бы зьвярнуць вашу ўвагу на тое, што выраз "народны прэзідэнт" мае і іншае значэньне. Сутнасьць яго ў тым, што такі чалавек павінен праз сваю палітыку імкнуцца аб'яднаць увесь народ, узьняць яго дух, яго патрыятычныя пачуцьці. Зрабіць гэта магчыма толькі на шляху выхаваньня гонару за сваю гісторыю, павагі да сваёй культуры, у тым ліку і да мовы. Гэта і ёсьць галоўнае правіла ў дзейнасьці любога сапраўды народнага прэзідэнта. Відаць, таму ні мне, ні вам не вядомы палітычныя дзеячы, якія б у адносінах да культуры і мовы свайго народа паводзілі сябе так, як гэта дазваляеце сабе вы.

Ведаючы, што асабістыя рысы характару і ўзровень культуры кіраўніка дзяржавы з такой уладай, як у вас, не могуць не сказвацца на дзяржаўнай палітыцы, а памылкі могуць небясьпечна адбівацца на жыцьці людзей, улічваючы, што вашыя нападкі на беларускую мову і на тых, хто адстойвае права яе дзяржаўнага існаваньня, з псіхалагічнага пункту гледжаньня могуць быць расцэнены, як праява схаванай у падсьвядомасьці боязьні раскрыць свой нізкі культурны ўзровень (варыянт праявы комплекса псіхалагічнай непаўнавартасьці). На жаль, апошняе можа быць выкарыстана недобразычліўцамі беларускага народа. Пагэтаму дазвольце выказаць вам параду - вывучыце беларускую мову. Гэта абыдзецца таньней і для вас (вашага аўтарытэту), і для ўсяго беларускага народа.

Калі ж вашыя нападкі на дзяржаўную мову зьяўляюцца праявай сьвядомай палітыкі, тады мы маем дачыненьне з іншай сітуацыяй.

Яшчэ не ў самым горшым выпадку вашыя паводзіны могуць быць растлумачаны жаданьнем адцягнуць увагу грамадзтва (праз узбуджэньне барацьбы паміж патрыётамі Беларусі і антыбеларускімі сіламі) ад невыкананьня сваіх перадвыбарчых абяцаньняў, якія датычылі станоўчых зрухаў у эканоміцы і паляпшэньня дабрабыту людзей. Гэта яшчэ па-чалавечы можна зразумець, але і гэта вельмі небясьпечны шлях. Калі ж вашыя "няўдалыя" выступы - гэта сігнальныя сьцяжкі палітыкі, прадыктаванай вам у Маскве ды Сочы і накіраванай на здачу суверэнітэта Беларусі (а значыць, галоўных эканамічных і палітычных каштоўнасьцяў беларускага народа) на карысьць інтарэсаў расейскіх нафтавай, газавай, вайсковай і іншых мафій, тады рыхтуйцеся да сапраўднай барацьбы. Але заранёў скажу, што вам я не зайздрошчу. Мова, якую стагоддзямі спрабавалі растаптаць, у любым выпадку перажыве некалькі год вашага кіраваньня, і максімум, чаго вы здолееце дамагчыся, дык гэта кавалка бруднай герастратавай славы.

P.S. На ўсякі выпадак нагадаю (каб не атрымалася канфузу, як са славутым дзяржаўным беларускім дзеячом Львом Сапегам), што Герастрат - гэта не наш сучасьнік.

А.АСТРОЎСКІ,
прафесар кафедры біялогіі Гарадзенскага медінстытута, доктар медыцынскіх навук.

1995 – ГОД СВІНЬНІ



РАСЬЦІ ВЯЛІКІ!

РЫНАК ПАТРАБУЕ ЯКАСЬЦІ

У абставінах, калі рынак Беларусі насычаны цыгарэтамі замежнай вытворчасьці, гарадзенская тытунёвая фабрыка "Нёман" робіць усё магчымае, каб яе прадукцыя была больш канкурэнтаздольнай.

Нядаўна заключаны пяцігадовы кантракт з ангельскай фірмай "Універсал Ліф" на пастаўку тытуню, які яна набывае больш чым у пяцідзесяці краінах сьвету. Зараз адбываюцца перамовы з адной з галандскіх фірмаў.

Адначасова прадпрыемства паступова адмаўляецца ад паслуг традыцыйных пастаўшчыкоў сыравіны ў Азербайджане, Кіргізіі, Таджыкістане, Узбекістане. Толькі ў мінулым годзе ім вернута 72 вагоны недабраякаснага тытуню.

У наступным годзе на фабрыцы плануецца пачаць выпуск новых цыгарэт пад назвай "Агонёк".

В.Г.

НЕ ДАПАМАГЛІ НАВАТ СПОНСАРЫ

Падведзены вынік падпіскі на першае паўгоддзе рэспубліканскіх, мясцовых і замежных выданьняў перыёдыкі. Сапраўдным лідэрам зьяўляецца тут орган абласнога і гарадзкога Савета дэпутатаў "Гродзенская праўда": на яе падпісалася толькі ў Горадні 20057 чалавек. Далей сімпатыі гарадзенцаў размеркаваліся так: "Народная газета" - 4966, "Рэспубліка" - 3437, "Советская Белоруссия" - 2369, "Звязда" - 830, "Свабода" - 821, "Пагоня" - 391, "Мы и время" - 271, "Новая Народная газета" - 150.

На расейскія выданьні жыхары Горадні падпісаліся наступным чынам: "Аргументы и факты" - 4978, "Известия" - 1031.

Як бачна, перавагу гарадзенцы аддаюць больш дэмакратычным незпалітызаваным выданьням, аб чым дадаткова сьведчыць колькасьць падпісчыкаў на такія газеты, як "Мы и время", "Новая Народная газета", якім не дапамаглі ні спонсары, ні палітыка загаду рэдактара "Новай Народнай газеты" Н.П.Машэравай здабыць падпісчыкаў праз сетку афіцыйнай ветэранскай арганізацыі.

Г.ДАМІНІКАНСКІ.

ІЗНОЎ ТАЛОНЫ

Нечаканы калядны падарунак атрымалі жыхары Прынёманскага краю ад Гарадзенскага аблвыканкама.

На першай сёлетняй радзе вырашана наноў увесьці карткі на сьметанковае масла.

Па картцы гарадзенцы змогуць атрымаць усяго 300 грамаў гэтага гатунку ежы.

А.С.

ЗЬБЕГЛІ З ВЫРУЧКАЙ

Двух беспрацоўных накіраваў Гарадзенскі цэнтр занятасьці на часовую працу - гандаль навагоднімі елкамі на пляцоўцы, што побач з крамай "Фіялка". Спадзяваліся ў цэнтры занятасьці, што дадуць магчымасьць бедалагам крыху падзарабіць.

Тыя ж выкінулі неспадзяванку: нагандляваўшы амаль 400 тысяч рублёў, зьбеглі з выручкай. А ў сьпешцы нават згубілі пашпарт.

М.ВАСІЛЕВІЧ.

КРАДУЦЬ УСЁ, ШТО ПАД РУКІ ТРАПЛЯЕ

Сярод белага дня прама з-пад носа супрацоўнікаў другой стаматалагічнай паліклінікі злодзеі скралі некалькі былых у карыстаньні халатаў і радыёкропку.

(Ул.інф.)

БЕЛАРУСКІХ ЛЁТЧЫКАЎ БУДЗЕ РЫХТАВАЦЬ УКРАІНА

Начальнік Упраўленьня зьнешніх сувязяў Міністэрства абароны падпалкоўнік Д.Шыла пацьвердзіў, што падчас нядаўняга візіту ў Менск украінскага прэм'ера Масола было падпісана пагадненьне, у адпаведнасьці з якім беларускія вайсковыя лётчыкі будуць праходзіць навучаньне ў вайсковых вучэльнях на Ўкраіне. Мінабароны Беларусі раней заяўляла, што падрыхтоўка лётчыкаў на Ўкраіне будзе каштаваць удвая дзешавей, чым у Расеі, дзе яны праходзілі навучаньне дагэтуль.

Д.Шыла адзначыў, што па гэтаму пагадненьню Ўкраіна атрымае магчымасьць рамантаваць авіяцыйную і браніраваную тэхніку на беларускіх рамонтных заводах. Па яго словах, дакумент не прадугледжвае кааперацыі ў вытворчасьці вайсковай тэхнікі.

СІМ

ПАЦЯРПЕЎ З-ЗА ПЕРАКАНАНЬНЯЎ

Да вас зьвяртаецца Орпік Павел Адольфавіч. Больш семнаццаці гадоў я прапрацаваў загадчыкам аддзелам адукацыі Воранаўскага райвыканкама Гарадзенскай вобласьці. 13 ліпеня бягучага года быў звольнены з працы, як указана ў рашэньні выканкама, "за сістэматычнае невыкананьне сваіх працоўных абавязкаў". У прадугледжаны законам тэрмін, будучы не згодным з прынятым рашэньнем, я зьвярнуўся з іскам у суд аб аднаўленьні мяне на працы. 13 кастрычніка выканкам у працэсе судовага разгляду справы зьмяніў падставы майго звальненьня, прызнаўшы незаконнасьць раней прынятага рашэньня. Суду былі прадстаўлены акты рэвізіі фінансава-крэдытнай дзейнасьці аддзела адукацыі, якая была праведзена пасьля майго звальненьня без майго ўдзелу, але ставіла на мэце зьвінаваціць у чымсьці чалавека, чыя жыцьцёвая і прафесійная пазіцыя не заўсёды падабалася кіраўніцтву райвыканкама. І толькі да чацьвёртага пасяджэньня суда было вынесена рашэньне выканкама аб маім звальненьні, але ўжо па артыкулу 254 пункту 1 КЗаП РБ з фармулёўкай - "за аднаразовае грубае парушэньне працоўных абавязкаў".

Матэрыялы праверкі фінансава-гаспадарчай дзейнасьці былі перададзены ў пракуратуру Воранаўскага раёна. Суд у такой сітуацыі быў вымушаны адкласьці разгляд іска па сутнасьці да вырашэньня ўсіх неабходных пытаньняў пракуратурай.

Я ў свой час быў зарэгістраваны кандыдатам у дэпутаты ВС РБ. Мая перадвыбарчая праграма адрозьнівалася ад той, якую вылучыў адзін з кіраўнікоў раёна. Я лічыў, што трэба прыкладаць намаганьні ў нацыянальным адраджэньні, захаваньні традыцый усіх нацый, якія пражываюць на тэрыторыі раёна, і рабіць канкрэтныя захады па вырашэньню гэтых пытаньняў. У прыватнасьці, улічваючы, што ў раёне пражывае 86 працэнтаў палякаў, я лічыў, што гэта павінна ўлічвацца пры арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу ў школах. Мае прапановы не ўтрымлівалі нічога, што магло б быць расцэнена інакш як улік інтарэсаў усіх жыхароў раёна, незалежна ад нацыянальнай прыналежнасьці, веравызнаньня.

Дэпутатам ВС РБ я не стаў, аднак перадвыбарчая барацьба адбілася на адносінах да мяне кіраўніцтва раёна. У сваёй іскавай заяве аб аднаўленьні на працы ў якасьці абгрунтаваньня сваіх патрабаваньняў я ўказаў: "Падставай вызваленьня мяне ад займаемай пасады сталі разнагалосьсі з кіраўніцтвам выканкама па пытаньнях нацыянальнага, палітычнага і рэлігійнага характару". Я разумею, што іх прызнаньне выканкамам азначала б прызнаньне парушэньняў канстытуцыйных правоў і свабод асобы, якія маюць месца ў нашым раёне. Але гэта асобная тэма, якая патрабуе ўсебаковай праверкі, бо зьвязана з аргвывадамі на кадравых пытаньнях, у тым ліку і першых асоб раёна.

З павагай да вас

ОРПІК Павел Адольфавіч.

P.S. Калі ліст рыхтаваўся да друку, стала вядома, што яго аўтар быў абраны на справаздачна-выбарчай канферэнцыі старшынёй Воранаўскага раённага аддзела Саюза палякаў Беларусі. Ён жа атрымаў адказ з Воранаўскай пракуратуры, у якім пракурор раёна, саветнік юстыцыі Е.Труцько паведаміў, што "ўзбуджэньні крымінальнай справы ў адносінах да Вас адмоўлена за адсутнасьцю ў Вашых дзеяньнях складу злачынства".

ЧАТЫРЫ ДУХОЎНЫЯ ЗАКОНЫ. ЦІ ЧУЛІ ВЫ ПРА ІХ?

ЗАКОН ПЕРШЫ

Бог любіць вас, і ў яго ёсьць цудоўная, дзівосная задума адносна вашага жыцьця.

Божая любоў:

"Бо так палюбіў Бог сьвет, што аддаў Сына Свайго адзінароднага, каб кожны, хто верыць у Яго, не загінуў, але меў вечнае жыцьцё".

(Ев. паводле Іаана 3:16).

Божая задума

Хрыстос сказаў: "Я прыйшоў дзеля таго, каб мелі жыцьцё, і мелі з лішкам, г.зн. не проста жыцьцё-існаваньне, а паўнацэннае жыцьцё, напоўненае глыбокім духоўным сэнсам".

(Ев. паводле Іаана 10:10).

Чаму ж тады ў большасьці людзей няма гэтага "жыцьця з лішкам"?

Таму што...

ЗАКОН ДРУГІ

Чалавек грэшны і адасоблены аб Бога. Таму чалавек не здольны ні пазнаць, ні адчуць любоў Бога і яго задуму.

Чалавек грэшны

"Бо ўсе саграшылі і пазбаўленыя славы Божай".

(Пасл. да рымлянаў 3:23).

Чалавек быў створаны для таго, каб мець лучнасьць з Богам, але з-за ўпартага свавольства чалавек абраў свой уласны шлях. У выніку гэта лучнасьць з богам была парушана. Гэтае свавольства, якое праяўляецца ў актыўным непаслушэнстве Богу ці проста ў абыякавых адносінах да Яго, Біблія называе грахом.

Чалавек адлучаны ад Бога.

"Бо адплата за грэх - сьмерць" (духоўнае адлучэньне ад Бога)

(Пасл. да рымлянаў 6:23).

Бог сьвяты, а чалавек грэшны. Вялізная бездань разьдзяляе іх. Чалавек увесь час намагаецца дасягнуць Бога і жыцьця з лішкам сваімі ўласнымі сіламі, напрыклад, добрымі ўчынкамі, філасофіяй ці рэлігіяй.

На адзінае выйсьце з гэтага тупіка ўказвае трэці закон.

ЗАКОН ТРЭЦІ

Ісус Хрыстос - адзіны. дадзены Богам шлях выратаваньня ад чалавечага граху. Праз яго вы можаце пазнаць і адчуць любоў Бога і яго задуму.

Ён памёр за нас

"Але Бог Сваю любоў да нас даводзіць тым, што Хрыстос памёр за нас, калі мы былі яшчэ грэшнікамі".

(Пасл. да рымлянаў 5:8).

Ён уваскрос з мёртвых

"Хрыстос памёр за грахі нашыя... Ён быў пахаваны і ўваскрос на трэці дзень, паводле Пісаньня, і... зьявіўся Кіфу, пасьля дванаццаці; пасьля зьявіўся болей чым пяцістам братам..."

(І пасл.да карыньцянаў 15:3-6).

Хрыстос - адзіны шлях да Бога

"Ісус сказаў яму: Я і шлях, і праўда, і жыцьцё. Ніхто не прыходзіць да Айца, калі не цераз Мяне".

(Ев. паводле Іаана, 14:6).

Сьмерць Ісуса Хрыста - адзіны мост выратаваньня, які Бог перакінуў цераз бездань, што разьдзяліла Яго і чалавека. Прыняўшы замест нас сьмерць, Ісус "заплаціў" за нашыя грахі і зьняў з нас цяжар пакараньня.

Недастаткова проста ведаць гэтыя тры законы...

ЗАКОН ЧАЦЬВЁРТЫ

Нам трэба асабіста прыняць Ісуса Хрыста як Збаўцу і Госпада, толькі пасьля гэтага мы здолеем пазнаць любоў Бога і Яго задуму.

Нам трэба прыняць Хрыста

"А тым, хто прыняў Яго, тым, хто верыць у Яго, даў Ён ім сілу дзяцьмі Божымі стацца"

(Іаана 1:12).

Мы прыймаем Хрыста верай

"Бо ласкай вы збаўленыя праз веру, і гэта не ад вас, Божы дар: не ад учынкаў, каб ніхто не хваліўся"

(Пасл. да эфэсцаў 2:8,9).

Прыняўшы Хрыста, мы нараджаемся нанава

(Глядзіце Іаана 3:1-8).

Мы прыймаем Хрыста шляхам асабістага запрашэньня. Хрыстос сказаў: "Вось, стаю пры дзьвярах і стукаюся: калі хто пачуе голас Мой і адчыніць дзьверы, увайду да яго..." (Адкрыцьцё 3:20).

Прыняцьцем Хрыста зьяўляецца зварот да Бога ад самога сябе (пакаяньне) і рашэньне дазволіць Хрысту ўвайсьці ў нашае жыцьцё, прабачыць нашыя грахі і зрабіць з нас такіх людзей, якімі Ён жадае нас бачыць. Недастаткова проста розумам усьвядоміць, што Ісус Хрыстос ёсьць Сын Божы і што Ён памёр на крыжы за нашыя грахі. Таксама недастаткова мець эмацыянальныя перажываньні. Галоўнае - прыняць Хрыста верай. Прыняцьце Хрыста верай - гэта дзеяньне нашай волі.

ПАСТАНОВА ГАРАДЗЕНСКАЙ АБЛАСНОЙ РАДЫ ТБМ ІМЯ ФРАНЦЫШКА СКАРЫНЫ

Разгледзеўшы праблемы выкананьня Закона аб мовах у Гарадзенскай вобласьці, Гарадзенская абласная рада ТБМ імя Францішка Скарыны адзначае, што ў апошні час пэўнымі сіламі ў дзяржаўным кіраўніцтве інсьпіруецца супрацьдзеяньне яго правядзеньню ў жыцьцё. Разам з тым ёсьць пэўныя падставы сьцьвярджаць, што на Гарадзеншчыне Закон аб мовах можа быць выкананы пасьпяхова і ў вызначаныя тэрміны. Грунтуючыся на гэтым, Гарадзенская абласная рада ТБМ імя Францішка Скарыны пастанаўляе:

1. Працягваць курс на супрацоўніцтва са здаровымі сіламі ў структурах выканаўчай і прадстаўнічай улады з мэтай больш поўнага ўцягненьня органаў улады ў працэс выкананьня Закона аб мовах.

2. Усьведамляючы асабліва важную ролю школы ў справе дзяржаўнага і моўна-культурнага адраджэньня Беларусі, аказаць усю магчымую падтрымку органам, установам і работнікам адукацыі ў іх дзейнасьці на ніве беларусізацыі.

3. Працягваць разгортваць структуры таварыства, ператтвараючы яго ў непалітычную нацыянальна-патрыятычную асьветніцкую сілу.

4. Даваць рашучы адпор любым праявам нацыянальнага нігілізму і грэблівага стаўленьня да мовы беларускага народа. Задзейнічаць для гэтага ўсе магчымыя сродкі.

5. Весьці шырокую прапаганду становчых зьменаў у галіне моўнай палітыкі і стану мовы.

6. Заклікаць настаўнікаў Гарадзеншчыны выступаць праваднікамі беларускай мовы ў жыцьцё.

7. Накіраваць дэлегацыю абласной і гарадзкой рады ТБМ да старшыні аблвыканкама для дамовы аб супрацоўніцтве ў галіне моўнай палітыкі.

8. Даручыць старшыням Гарадзенскай абласной і гарадзкой радаў падрыхтаваць зварот да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па праблемах дзяржаўнай мовы ў краіне.

9. Даручыць Гарадзенскай гарадзкой радзе ТБМ разгледзець праблемы Гарадзенскай філіі грамадзкага адукацыйнага цэнтра з мэтай аказаньня неабходнай дапамогі.

10. Рэкамендаваць суполкам ТБМ прыняць удзел у сьвяткаваньні 50-годдзя заканчэньня Другой сусьветнай вайны з пазіцыі нацыянальнага прымірэньня.



СУМЕЖЖА

ВІЛЕНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Летува падпісала з кіраўніцтвам расейскага "Газпрама" пагадненьне аб пастаўках прыроднага газу ў краіну ў 1995 годзе. Дасягнута дамоўленасьць, што яна сёлета атрымае 2,5 мільярда кубаметраў газа па 72 долара за тысячу кубічных метраў. Абмяркоўвалася магчымасьць заснаваньня сумеснага летувіска-расейскага прадпрыемства па пастаўках газа.

На сярэдзіну студзеня ў Маскве запланавана сустрэча прэм'ераў Летувы і Расеі. Адным з асноўных пытаньняў будзе абмеркаваньне доўгатэрміновай праграмы пастаўак Расеяй Летуве нафты і газа.

* * *

Урад Летувы вырашыў аказаць Грузіі гуманітарную дапамогу - 2 тоны масла і 4,5 тысячы тон бляшанак мясных кансерваў. На набыцьцё гэтых прадуктаў Міністэрству сельскай гаспадаркі дазволена выкарыстаць 30 тысяч літаў з сродкаў, прызначаных на фінансаваньне нацыянальнай праграмы сельскай гаспадаркі.

* * *

У Каўнасе вернікам вернуты касьцёл сьв.Гертруды, які пабудаваны ў другой палове XV стагоддзя.

Ужо скончаны зьнешнія рамонтныя работы, зробленыя за кошт дзяржавы. Унутранае аздабленьне даробіць кангрэгацыя манахаў-марыянцаў, якая больш пяцісот год таму пабудавала гэты храм і якой ён цяпер вернуты.

* * *

У кастрычніку мінулага года ўрад Летувіскай Рэспублікі прыняў рашэньне аб адмене візавага рэжыму для грамадзян ЗША, што прыязджаюць у Летуву на 90 дзён і больш кароткі тэрмін. З улікам гэтага пасольства ЗША ў Летуве паведаміла, што з 19 сьнежня 1994 года грамадзянам Летувы выдаюцца візы ЗША, сапраўдныя на працягу 10 гадоў (максімальны тэрмін дзеяньня візы, прадугледжаны законамі Злучаных Штатаў).

Дагэтуль максімальны тэрмін сапраўднасьці віз, што выдаваліся ў амерыканскім пасольстве, складаў 12 месяцаў.

* * *

Консул Летувы ў Калінінградскай вобласьці Расеі А.Шылярыс лічыць, што ўплыў Летувы на "зямлю продкаў" можа саслабець. На яго думку, прадпрымальнікі Летувы надта мала цікавяцца ёй. Калі імпарт Калінінграда з Летувы складае пяць працэнтаў, то з Нямеччыны і Польшчы - 19 і 25 працэнтаў усёй імпартуемай прадукцыі.

Консул лічыць, што Летува не павінна была адмаўляцца ад расейскага транзыта грузаў у Калінінград. А.Шылярыс назваў "дыпламатычнымі гульнямі" заявы Польшчы аб тым, што яна не мае намеру дамаўляцца з Расеяй пра вайсковы транзыт праз сваю тэрыторыю. На яго думку, Польшча хацела б даць такую магчымасьць Расеі, і сцьвярджае, што бачыў схемы транзыту праз польскую тэрыторыю.

МГ

ВЕСТКІ З ПОЛЬШЧЫ

Нарвежскі канцэрн "Оркля" выкупіў 51% акцый выдавецкага агенства "Эдытар", якое выдае беластоцкую газету "Кур'ер паранны".

Раней гэты ж канцэрн выкупіў акцыі іншай беластоцкай газеты "Газета вспулчэсна".

* * *

Мітрапаліт Васілій наведаў Бельск-Падляскі. Першаіерарх Польскай Аўтакефальнай Праваслаўнай царквы ўзначаліў набажэнства, прысьвечанае памяці сьвятога Міхаіла. Таксама Мітрапаліт правёў шэраг гутарак з насельніцтвам.

* * *

Міністэрства замежных спраў Польшчы не знайшло падстаў прызнаць віцэ-консула Расейскай Федэрацыі ў Кракаве Барыса Шардакова персонай нон грата.

Міністр замежных спраў Анджэй Алехоўскі палічыў, што выказваньні Шардакова, які параўнаў Пілсудзкага са Сталіным, не ўяўляюць афіцыйнай палітыкі Расеі.

* * *

У васьмі гмінах Беласточчыны, у якіх найвышэйшы паказчык беспрацоўя, урадам краіны выдаткавана шэсьць мільярдаў злотых на публічныя работы.

Найбольш беспрацоўных зарэгістравана ў гмінах: Бельск-Падляскі - 2565, Чорна-Беластоцкая, Дуброва-Беластоцкая, Гайнаўка, Лапы, Манькі, Сакулка.

* * *

Дэнамінацыя злотых (1:10000) праведзена з першага студзеня 1995 года. Уведзены ў абарачэньне дзевяць манет вартасьцю 1, 2, 5, 10, 50 грошаў і 1, 2, 5 злотых і тры купюры: 10, 20 і 50 злотых.

Ста- і двухсотзлотавыя банкноты будуць уведзены пазьней.



НА ЗДЫМКУ: Вільня. Слынная Вострая Брама з Вострабрамскай капліцай, у якой знаходзіцца цудоўны вобраз Маці Боскай.

Фатаграфаваў Уладзіслаў СТРУМІЛА.

ХЕЛЬМУТ БАЛДЭРЫС: «ТЫДНІ ДВА ПАТРЭНІРУЮСЯ... І ЗГУЛЯЮ»

Аматары хакею другой паловы васьмідзесятых добра памятаюць віртуознае катаньне на каньках і фенаменальную хуткасьць гульца рыжскага "Дынама" Хельмута Балдэрыса. Лёс Балдэрыса-хакеіста вельмі складаны: фактычная дэпартацыя з любімага клуба на грунце ўзмацненьня гульні зборнай СССР да маскоўскага ЦСКА не паспрыяла хакейнаму росквіту таленту Хельмута. У ЦСКА ён неяк зьнік, а можа, гэтаму перашкодзілі такія зоркі, як Б.Міхайлаў, У.Пятроў, В.Харламаў?

На гэтыя ды іншыя пытаньні сам Хельмут даў адказ у інтэрв'ю рэпарцёру "Камсамольскай праўды".

"Безумоўна, гэта быў хакей, якога на тэрыторыі 1/6 сушы цяпер ужо няма, - успамінае Хельмут Балдэрыс. - У кожнай каманьдзе было па пяць-шэсьць зорак, ды яшчэ па восем-дзевяць класных хакеістаў. Таму вось вам і адказ на пытаньне. Чаму так бліскуча гуляла зборная СССР: Якумаў, Мальцаў, Трацьцяк, Міхайлаў, Путчанка, Пятроў, Харламаў. Усе зоркі, віртуозы, імправізатары. Вытрымаць жорсткую канкурэнцыю з імі было не проста. А што сёньня? Сёньня засталіся толькі хакеісты сярэдняга ўзроўню. Нават прозьвішчы іх не запамінаюцца. Мне прыемна, што і я з таго гурта знакамітых гульцоў. Да першай зборнай мяне запрасіў Барыс Кулагін. Потым, пасьля правалу чэмпіяната сьвету ў 1977 годзе, па загаду ўплывовых чыноўнікаў ЦК КПСС разам з Сяргеем Капусьціным і Сяргеем Бабінавым мяне перавялі да ЦСКА. Хоць у гэтым клубе я стаў чэмпіёнам сьвету, Эўропы і СССР, але гульню сваю нейк страціў. Дзеля яе і вярнуўся праз тры гады зноў дамоў у "Дынама". Відаць, было ўжо позна, бо стаць тым Балдэрысам, якога памятала хакейная Рыга, не змог.

Ад'езд у 1985 годзе да Японіі - пацьверджаньне таго, што я быў ужо іншы.

Чатыры гады працы гуляючым трэнерам дапамаглі ўзьняць спартыўны дух, забясьпечылі матэрыяльна. Калі вярнуўся, то прыняў прапанову ўзначаліць рыжскае "Дынама". Працаваў нядоўга, бо прыйшло запрашэньне з НХЛ".

Пра гэта Хельмут успамінае так: "Папрасіў прабачэньня перад камандай, сказаўшы, што напрыканцы кар'еры гульца хачу яшчэ раз выпрабаваць сябе". У НХЛ Балдэрыс атрымаў гадавы кантракт. Згуляў за клуб "Паўночныя зоркі" 26 гульняў.

Працягнуць кар'еру ў НХЛ перашкодзілі траўмы і "скурныя апетыты" функцыянераў ад хакею. За сваю працу Х.Балдэрыс атрымліваў усяго 10 % ад кантрактнай сумы. Астатняе ішло на рахунак Федэрацыі.

Да таго ж, у ЗША Хельмуту даводзілася плаціць 37 % на падаткі.

Пасьля вяртаньня ў Рыгу пагуляў яшчэ за каманду другой лігі, а затым стаў генеральным менеджэрам мясцовай "Параўгавы" і трэнерам зборнай Латвіі.

Пад яго 19-м нумарам сёньня ўжо ніхто ў Латвіі не гуляе, бо так вырашыла Федэрацыя хакею Латвіі. Хакейны строй Балдэрыса на Радзіме хакеіста стаў рэліквіяй. Але як бы ні шанавалі ў Латвіі памяць аб Хельмуце, ён не жадае быць ні трэнерам, ні гульцом. Прычына - адносіны чыноўнікаў з федэрацыі да разьвіцьця хакею ў рэспубліцы.

Зараз Балдэрыс - дырэктар рыжскага Палаца спорту. За час працы, дзякуючы сваёй выназходлівасьці, Хельмут навёў поўны парадак у палацы.

Мінулай восеньню ён з настальгіяй глядзеў на турнэ расейскіх зорак "Дрым-цім", бо з многімі з тых, хто быў на лёдзе, Хельмут гуляў не адну гульню. "З задавальненьнем згуляў бы з імі яшчэ раз, - кажа Балдэрыс, - тыдні б два патрэніраваўся і згуляў бы".

ДВА ГАДЫ ЗАМЕСТ 6000 ДОЛАРАЎ

У Румыніі расквітнеў новы від бізнесу - гандаль немаўлятамі. Па новых законах краіны пры зьдзяйсьненьні гэтакіх злачынстваў караюцца не толькі пасрэднікі, але і самыя пакупнікі і прадаўцы. Так, нядаўна суд у Бухарэсьце прыгаварыў сямейную пару з Англіі за набыцьцё немаўляці да 2-х гадоў 4 месяцаў турмы. Дзіця было набыта ў пасрэднікаў за 6 тысяч долараў. Семнаццацігадовыя бацькі атрымалі толькі 600. У турму пойдуць пасрэднікі, а таксама бацькі, толькі пасьля таго, як дасягнуць паўналецьця.

С.Гарошка.

РЭКЕЦІРЫ ЗАМУЧЫЛІ НАХАБСТВАМ

У Берасьці адбылася сустрэа дэлегацый МУС Беларусі і Галоўнай камендатуры паліцыі Польшчы.

З нашага боку ў сустрэчы ўзяў удзел намесьнік міністра ўнутраных спраў Сяргей Рухлядзеў, з польскага - кіраўнік Галоўнай камендатуры паліцыі Зянон Смолярэк. Пасьля сустрэчы падпісаны пратакол аб разьвіцьці супрацоўніцтва, якое прадугледжвае эфектыўнае і канкрэтнае ўзаемадзеяньне бакоў па прафілактыцы злачыннасьці і барацьбы з ёй.

Да праекта аб калектыўнай сістэме супрацоўніцтва ў барацьбе са злачыннасьцю ў найбліжэйшы час павінны далучыцца МУС Расеі, Украіны і краін Прыбалтыкі. Дзеля гэтага 11-13 студзеня плануецца візіт у Менск міністра ўнутраных спраў Польшчы.

Прычынай для стварэньня калектыўнай службы па барацьбе са злачыннасьцю праваахоўных органаў Беларусі і Польшчы стала ўзмацняючаяся інтэрнацыяналізаваная, зарганізаваная злачыннасьць. Транзіт наркотыкаў праз тэрыторыю Беларусі і Польшчы, бандытызм на аўтамагістралях - усё гэта выйшла за рамкі лакальных праблем і запатрабавала аб'яднаных высілкаў барацьбы супраць росквіту крымінальнага элементу.

СІМ

ДРУСКЕНІКІ — НЕ ТОЛЬКІ КУРОРТ

У 1993 годзе медыкі Летувы афіцыйна зарэгістравалі 629 наркаманаў і асобаў, якія трапілі ў залежнасьць да наркотыкаў. А эксперты ААН выказалі два гады таму назад меркаваньне, што наркаманаў у Летуве каля 10 тысяч.

Друскенікі часта называюць сталіцай наркаманаў Летувы. Першы наркаман - Юргіс Янчкаўскас - зьявіўся ў горадзе прыкладна 20 гадоў таму назад. У мінулым годзе яго знайшлі мёртвым. Колькасьць 30-40-гадовых наркаманаў, якія паміраюць, расьце ў Друскеніках з кожным годам.

Па зьвестках паліцыі, цяжкія злачынствы за наркаманамі пакуль не лічацца. На іх рахунку - пераважна дробныя крадзяжы з балконаў, памяшканьняў, сушылак. Сярод друскеніцкіх наркаманаў набярэцца паўтара дзесятка жанчын і зусім маладых дзяўчат. Ёсьць і сем'і, у якіх наркотыкі ўжываюць і муж, і жонка. Дзеці ў іх пакінуты на волю лёсу. Рэдка ў якога наркамана ёсьць сталая праца. У гарадзкой паліклініцы на дыспансерным уліку знаходзяцца 34 наркаманы. На прафілактычным - 67 чалавек. У гэтым годзе гарадзкі камісарыят паліцыі за набыцьцё, хананьне і выкарыстаньне наркатычных рэчываў узбудзіў звыш дзесятка крымінальных спраў. 16 чалавек, якія ўпершыню пакаштавалі наркотыкі, пакараны ў адміністрацыйным парадку. Паліцыя называе Лазьдзіяйскі, Алітускі і Варэнскі раёны "бермудзкім трохкутнікам". Менавіта тут квітнее макавы промысел. Мак высяваюць у калектыўных садах, на хутарах, у гарадах, лясной глушы, на палях сярод збожжа.

Раней, калі попыт на наркотыкі не быў такім вялікім, наркаманы здабывалі мак у вёсках. Жыхары аддавалі яго проста так або ўзамен на цукар, крупы. За мак можна было атрымаць і крадзеныя рэчы: прас, ровар, прасьціну. У апошнія два-тры гады адчуваецца эўрапеізацыя - трэба плаціць доларамі, пагэтаму наркаманы часта крадуць мак, за што іх б'юць. Канфліктуючыя бакі не зьвяртаюцца, аднак, у паліцыю: баяцца крымінальнай адказнасьці.

Паліцыя падкрэсьлівае, што праз Паўднёвую Летуву не праходзяць пакуль шляхі міжнароднага транзыту наркотыкаў, таму рана пакуль сігналы ва ўсе званы.

Уладзіслаў СТРУМІЛА.



ЮБІЛЕІ

КАСТУСЬ МЕРЛЯК З НАВАГРАДЧЫНЫ І ЯГО ДЗЕЙНАСЬЦЬ НА ЭМІГРАЦЫІ

25 сьнежня спаўняецца 75 год з дня нараджэньня беларускага палітычнага і культурнага дзеяча на эміграцыі, публіцыста, мемуарыста Канстаньціна Мерляка. Імя гэтага чалавека зьявілася ў краязнаўчым календары Гарадзеншчыны не толькі як нашага земляка, аўтара буйной мемуарнай працы "Дзейнасьць Кастуся Мерляка на эміграцыі", але і як выдатнага прадстаўніка беларускага замежжа, з імем якога зьвязана ўтварэньне і дзейнасьць згуртаваньняў нашых суайчыньнікаў на Амерыканскім кантыненьце.





Канстаньцін Мерляк нарадзіўся ў в.Дзетамля Навагрудзкага павета ў сям'і мясцовага гаспадара, які да першай сусьветнай вайны быў настаўнікам Навагрудзкай школы, а пры Польшчы вымушаны быў займацца вясковай гаспадаркай. Сям'я Мерлякоў мела пяцёра дзяцей, з якіх Кастусь быў другім, і шмат крэўных, якія і сёньня жывуць на Навагрудчыне і Гарадзеншчыне. Кастусь атрымаў адукацыю, якая адлюстроўвала гістарычны лёс Заходнебеларускага рэгіёна. У 1934 г. ён скончыў 7-гадовую школу ва Ўсялюбе і потым на працягу трох гадоў вывучаў сельскагаспадарчую справу спачатку ў Кушалёне Навагрудзкага павета і Налечове каля Любліна. З прыходам савецкай улады скончыў курсы крэдытовых інспектараў Дзяржбанка ў Беластоку. Самастойна здолеў вывучыць нямецкую, італьянскую, ангельскую, французскую і гішпанскую мовы на працягу далейшых драматычных падзей яго жыцьцёвага лёсу.

Працоўны шлях Кастуся Мерляка пачаўся ў лютым 1939 г., калі ён уладкаваўся на працу бухгалтарам гаспадарчага таварыства ў Навагрудку. У савецкі час працаваў памочнікам старэйшага крэдытовага інспектара і старэйшым крэдытовым інспектарам Навагрудзкага аддзяленьня Дзяржбанка СССР. Падчас нямецкай акупацыі - супрацоўнікам гарадзкой управы Навагрудка і старшынёй сельсаветаў Навагрудзкага раёна. Далей - эміграцыя: Італія, Аргенціна, ЗША. Кастусь Мерляк пасьля розных выпрабаваньняў пачынае сталую працу ў вядомай транспартнай кампаніі "Голанд-Амерыка-Лайн", дзе зрабіў добрую кар'еру як спецыяліст, працуючы з 1954 па 1982 г.г. З 15 лютага 1989 года, пасьля 40 год бесперапыннай працы у сумежных кампаніях Галандыі, ЗША, Даніі і Грэцыі, спадар Мерляк знаходзіцца на пэнсіі.

Праз усё яго жыцьцё праходзіць чырвоным пасам адданасьць беларускай справе. Не гаворачы пра дзейнасьць падчас вайны, нагадаем толькі асноўныя вехі яго грамадзкіх спраў на ніве беларускай эміграцыі:

1948 г. - сябра Рады БНР, заснавальнік згуртаваньня Беларусаў у Аргенціне; 1959 г. - старшыня Галоўнай управы Беларуска-Амерыканскага Задзіночаньня ў Амерыцы (БАЗА); 1964 г. - старшыня ўправы Задзіночаньня беларускіх ветэранаў у Нью-Ёрку; 1971 г. - намесьнік старшыні Беларускага Кангрэсавага Камітэту Амерыкі; 1982 г. - старшыня царкоўнае ўправы Амерыканска-беларускай Праваслаўнай Царквы сьв.Кірылы Тураўскага.

Гэта далёка не поўны пералік грамадзкіх і рэлігійных пасад юбіляра ў справе дзейнасьці беларускай эміграцыі. Нельга не адзначыць яшчэ і супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі, такімі, як ліга вызваленьня народаў СССР (старшыня Нью-Ёркскай камісіі ў 1959-62 г.г.), амерыканская канферэнцыя вызваленьня нерасейскіх народаў СССР, з арганізацыямі рэспубліканскай партыі ЗША.

Кастусь Мерляк - вядомы публіцыст. У розныя гады ягоныя артыкулы, рэцэнзіі, лісты і іншыя матэрыялы друкаваліся за асабістым подпісам і пад псеўданімамі (К.Мацкевіч, Аргеньцінскі, К.Мароз, К.Мельнік, А.Гурда, Д.Маяк, К.М., К.Ц.Прысутны). З ініцыятывы і пры ўдзеле Мерляка былі ажыцьцёўлены важкія выданьні беларусаў за мяжой, што былі прысьвечаны беларусам у Аргенціне (1953), Дню Незалежнасьці Беларусі (1953, 1960), да заснаваньня Царквы сьв. Кірылы Тураўскага (1983). Але галоўным абагульняючым творам юбіляра стала энцыклапедыя жыцьця беларускай эміграцыі, якую ён выдаў у 1992 г. у Нью-Ёрку пад назвай "Дзейнасьць Кастуся Мерляка на эміграцыі. Пранікліваcьць і практычны падыход".

Сёньня не час гаварыць пра станоўчыя і адмоўныя бакі супярэчлівага жыцьця нашай беларускай дыяспары, якую выдатна адлюстроўвае і праца Кастуся Мерляка, і яго імкненьне аб'яднаць беларускае замежжа на канфесійнай аснове. Але нельга не адзначыць яго велізарную адданасьць роднаму краю, роднай зямлі, народу Беларусі, з лёсам якога Кастусь Мерляк адчувае сябе зьвязаным да канца.

Сёлета, пасьля доўгага перапынку, юбіляр наведаў Бацькаўшчыну, ужо Незалежную Беларусь. На пытаньне карэспандэнта "Народнай газеты" пра самаадчуваньне адказаў: "Мне вольна дыхаецца. Бачу ветлівых, прыгожых людзей, па якіх я вельмі смуткаваў. Жывецца ім цяжка, вось што мяне турбуе. У маёй Дзетамлі ў краме толькі хлеб ды нейкі сок. Людзі зарабляюць мала, самі кажуць, што крадуць паціхеньку - хто як выкручваецца. Заўважыў, што амаль трэць тых зямель, дзе раней былі палі, дзе я сам працаваў, зараз альбо пад лесам, альбо на той зямлі нічога не расьце. Зямля засталася без добрага дагляду, без гаспадара, гэта для мяне відавочна. Будзе гэтак і далей - згубіце зямлю, згубіце Беларусь. А можа, хопіць розуму - не згубім?.."

Прыслухаемся да гэтага чалавека, які пабачыў сьвет і ведае, што няма нічога даражэйшага, чым Бацькаўшчына.

А.МАЙСЯЁНАК.

НА ФОТАЗДЫМКАХ: К.МЕРЛЯК (першы зьлева) на аўдыенцыі ў віцэ-прэзідэнта ЗША Рычарда Ніксана ў Дзень Незалежнасьці Беларусі (сакавік, 1958г.); К.МЕРЛЯК (зьлева) уручае мэру Нью-Ёрка пракламацыю да Дня Незалежнасьці Беларусі (1964 г.).

ХТО ТАКІ ЯЗЭП БАЙДАЦКІ?

Сёлета споўнілася 85 год з дня нараджэньня (в.Байдаты Ваўкавыскага раёна) Язэпа Найдзюка-Александровіча, вядомага публіцыста, грамадзкага дзеяча Заходняй Беларусі, чалавека, які шмат зрабіў для адраджэньня праўдзівай гісторыі Беларусі.

Так адбылося, што вяртаньне імя Найдзюка на Радзіму змагло ажыцьцявіцца толькі падчас перабудовы, калі спадара Язэпа ўжо не было. У "Ніве" ад 12 лютага 1989 года Сакрат Яновіч пісаў: "У разбойны сталінізм, які па праўдзе ўсё яшчэ канчаецца, пісаць пра такога чалавека не было найменшай магчымасьці і нават паняцьце беларускага патрыятызму лічылася палітычна злачынным".

На фарміраваньне сьветапогляду Язэпа Найдзюка вялікі ўплыў зрабіў Фабіян Ярэміч, удзельнік Усебеларускага кангрэсу 1917 г., пасол Польскага сейма, арганізатар Беларускага сялянскага саюза, вязень сталінскага ГУЛАГа. Малады Найдзюк стаў актыўным прыхільнікам нацыянальна-вызваленчага руху, самаахвярным супрацоўнікам і дырэктарам Беларускай друкарні імя Францішка Скарыны ў Вільні. Там ён, разумеючы ролю гісторыі ў выхаваньні нацыянальнай самасьвядомасьці, пачаў працаваць над нарысам гісторыі Беларусі. Гэта ён выдаваў часопіс "Шлях моладзі", за што быў асуджаны і адсядзеў свой прысуд у Картуз-Бярозе, сумна вядомай турме для многіх прыхільнікаў справы адраджэньня.

У артыкуле "Беларуса" (N 327 за 1985 г.), прысьвечанага гадавіне сьмерці Язэпа Найдзюка, гаворыцца пра часопіс "Шлях моладзі": "Выданьне, дзякуючы арганізацыйным здольнасьцям, лагоднаму характару і суцэльнай адданасьці справе Язэпа Найдзюка, на працягу 10-ці год, да пачатку Другой Сусьветнай вайны, выконвала функцыю не толькі як цэнтра арганізацыі беларускай моладзі, але ў вялікай ступені і як каардынатара розных палітычных плыняў тагачаснай моладзі, якую яднала любасьць і праца да беларускага народа".

Вызвалены ў верасьні 1939 г. Язэп Найдзюк аддана працаваў на савецкую ўладу ў сродках масавай інфармацыі, але вельмі хутка прыйшло расчараваньне... Падчас вайны, пакліканы энтузіястамі стварэньня беларускай нацыянальнай школы, працаваў у выдавецтве школьных падручнікаў і, адчуваючы недакладнасьць гістарычнай адукацыі беларускіх вучняў, дапрацаваў і выдаў падручнік "Беларусь учора і сёньня".

Успамінае дачка Язэпа Найдзюка спадарыня Люцына Александровіч-Пеньдзіх: "Другая сусьветная вайна закінула майго бацьку ў Заходнюю Польшчу, у горад Інаўроцлаў, дзе пад прозьвішчам Александровіч быў вядомы як мясцовы культурны дзеяч і дасьледчык мінуўшчыны горада і навакольнай зямлі Куяваў. Палітычныя абставіны склаліся так, што Язэп не мог займацца Беларушчынай, якая запаланіла яго сэрца. Ён рэгулярна сустракаўся з іншымі даваеннымі беларускімі дзеячамі, асабліва Мар'янам Пецюкевічам, які жыў у суседнім Торуні. У семідзесятыя і васьмідзесятыя гады пашырыў беларускія кантакты ў Польшчы і за мяжою. Напрыканцы жыцьця працаваў над дапаўненьнем сваёй кніжкі "Беларусь учора і сёньня".

Трэба дадаць, што ў пасьляваенны час Язэп Найдзюк-Александровіч вельмі вызначыўся як тэхнічны спецыяліст, кіраўнік друкарні і грамадзкі дзеяч на Куяўшчыне. Не пакінуў ён сваёй гістарычнай і публіцыстычнай працы, друкуючы шматлікія матэрыялы па гісторыі, паліграфіі і краязнаўству.

Польская дзяржава адзначыла заслугі Найдзюка-Александровіча высокімі ўзнагародамі, што не замінала яму заставацца беларускім патрыётам, весьці нястомны і сумленны пошук каранёў беларускай гісторыі. Прапануем толькі адзін фрагмент з яго публіцыстычнай працы "Трэба апрацаваць і выдаць гісторыю Беларусі" (Зьніч. N 5 за 1959 г.): "З сорамам неабходна прызнацца, што мы не ведаем добра нават такіх вялікіх людзей з нашай гісторыі, як князя Рагнеды, князёў Усяслава Полацкага, Міндоўга, Гедыміна, Альгерда, Вітаўта і ягонага спрытнага сакратара Цыбулькі, Ягайлы, Сьвідрыгайлы, княжны Сонькі Гальшанскай, Казіміра Ягайлавіча, Вялікіх гетманаў Кішкі, Глінскага, Астрожскага, такіх вялікіх культурнікаў, як Скарыны, Льва Сапегі, Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага і шмат іншых. Не знаем добра сваіх летапісаў, гістарычных дакументаў, архіваў, у якіх знаходзяцца скарбы да нашай гісторыі. Не празнаяна дакладна і не апрацавана роля ў гісторыі Беларусі праз самых беларусаў магнацкіх родаў Радзівілаў, Хадкевічаў, Гаштольдаў, Чартарыскіх, Валовічаў і іншых у розныя перыяды. Дзірваном пакрыўся гэтак званы перыяд занепаду самастойнага беларускага жыцьця XVII і XVIII стагоддзяў, хоць і ў асобныя часы зьяўляліся парывы да адраджэньня.

Хоць бы і такое пытаньне: хто такі быў Тызенгаўз? Вялікі прамысловец, геніяльны эканаміст і патрыёт свайго краю другой паловы XVIII стагоддзя ці толькі рызыкант, фантазёр, слуга Станіслава Аўгуста Панятоўскага, апошняга караля польскага, ды эксплуататар беларускіх сялян? Нават постаць слаўнага Кастуся Каліноўскага і іншых барацьбаў за лепшую долю беларускага народа ў XIX стагоддзі не апрацаваная і не прадстаўленая гэтак, як належыла б. Больш таго, нават змаганьні беларусаў за самастойнае жыцьцё апошніх 50-ці гадоў не прадстаўлена як сьлед. Тым часам удзельнікі гэтых змаганьняў паміраюць, адыходзяць ад нас, не пакідаючы сваіх успамінаў, а дакументы і архівы гінуць у ваенных падзеях.

Вялікая віна ў гэтым тых цяжкіх абставін, у якіх мы жылі і жывём. Вялікая віна і нашых суседзяў як з Усходу, гэтак і з Захаду, якія ўсялякімі спосабамі стараліся і стараюцца прадставіць сьвету гісторыю сваіх краін і гісторыю Ўсходняй і Сярэдняй Эўропы гэтак, як быццам бы беларусаў наогул на сьвеце ніколі не было і няма. Але вялікую віну маем і мы, беларусы... Трэба прызнаць, што мы замала цікавіліся і цікавімся сваёй гісторыяй, сваёй мінуўшчынай, а больш часу і месца ў сваёй працы прысьвячаем неразумным спрэчкам, сваркам, найчасьцей за пустую торбу, аплёўваючы саміх сябе. Гісторыяй Беларусі займаліся ў нас толькі адзінкі, і то найчасьцей даволі паверхоўна, без глыбокага гістарычна-навуковага аналізу.

Калі б і зацікаўленьне гісторыяй было шырэйшае, мы абавязкова мелі б багацейшую ўласную гістарычную літаратуру, больш сьвядомых і стойкіх беларусаў, і справа Беларусі на міжнароднай арэне стаяла б даўно лепей..."

Галоўным творам і справай Язэпа Найдзюка застаецца кніга "Беларусь учора і сёньня". У гэтым годзе яна перавыдадзена выдавецтвам "Навука і тэхніка" і адразу ж стала бестсэлерам. Не дзіўна, што пэўныя постаці выказваюць незадаволенасьць зьяўленьнем гэтых тэкстаў, раней надзейна схаваных у спецсховах, забываючы не толькі пра тое, што само выданьне было жорстка "апрацавана" гітлераўскай цэнзурай, але і што сам рукапіс быў створаны аўтарам у перадваеннай Вільні...

Неабходна ўважліва прачытаць гістарычную спадчыну Я.Найдзюка, гэтага аўтара-аматара, не толькі вялікага праўдзіўца беларускай гісторыі, але і вялікага патрыёта Бацькаўшчыны, роднай Ваўкавышчыны і радзіннай калыскі - вёскі Байдаты, імя якой ён скарыстаў у сваіх публікацыях у якасьці псеўданіма.

Андрэй МАЙСЯЁНАК,
Старшыня Гарадзенскай краязнаўчай асацыяцыі.

праграма тэлеперадач

ПАНЯДЗЕЛАК, 9.01.

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

16.05 "Мой свет". Асоба 16.15 "Так гэта было..." 17.00 "Максім Багдановіч. Я не самотны...", д/ф 17.30 Урокі Наталлі Наважылавай 18.00 Навіны 18.10 Музычны антракт 18.25 Навіны (Бі-бі-сі) 19.00 Шоу-прагноз 19.05, 19.55 "Бойкае месца". Л. Хейфец 19.35 Праграма для дзелавых людзей 20.35 Калыханка 21.00 Панарама 21.40 Студыя "Культура" 21.55 Кліп-канцэрт 22.05 На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Спартыўны тэлекур'ер. "Мы жадаем шчасця вам..." Сустрэча з Маяй Гугулан. Пад купалам Сусвету

КАНАЛ "АСТАНКІНА"

7.45 "Сем дзён з Марсі". Мультфільмы 8.15 Калядны баль у Крамлі 9.15 П. Чайкоўскі. "Спячая прыгажуня". Сюіта з балета 10.00 Кніжны двор 10.35 Каханне з першага погляду 11.15 "Барэц і клоун", м/ф 13.05 Зорная гадзіна 13.45 Эх, шлях-дарожка франтавая 13.50, 22.50, 23.50 Навіны 14.00 "Астравок надзеі", д/ф 14.20 Творчы вечар кампазітара А. Іванова 15.20 "Ваш выхад, маэстра" 16.05 Калі... 16.50 У гэтыя дні 50 гадоў таму 17.05, 20.30 Надвор'е 17.15 Гадзіна пік 17.45 "Цацка", м/ф (ЗША) 19.40 Добрай ночы, малышы! 20.00 Час 20.40 Ралі Парыж — Гранада — Дакар 20.55 Залаты Авен 21.45 Гол 22.20 Анталогія гумару 23.05 "Начная феерыя"

КАНАЛ "РАСІЯ"

16.40 Вуснамі дзіцяці 17.10 "У пошуках збеглых мазгоў" 19.00, 22.00 Весткі 19.25 Свята кожны дзень 19.35 "Ключ да разгадкі", м/ф 20.40 Рэпарцёр 21.00 Момант ісціны 22.30 Рака часу 22.40 Аўтаімгненне 22.45 "Рускі транзіт", м/ф, с. 2 23.45 Калядныя мелодыі

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

10.00 Чароўная лінія 10.15 "Зноў чую голас твой" 10.45 "Прывіды з горада Айленберга". Тэлеспектакль 12.55 "Дзіўны манеж", мульт 13.10 "Мануэла", м/ф (Італія), с, 1 14.00 Хакей. СКА — "Хімік" (Васкрасенск) 16.15 Паласаты хіт 16.55 "Чаму зіма бывае". Муз. фільм 17.25 "Паехаў поезд у Бульзібар", м/ф 18.30 Інфарм ТБ 19.10 Вялікі фестываль 19.25 "Мануэла", м/ф (Італія), с. 1 20.00 "На біс" 21.00, 22.10 "Дзень на дваіх". Тэлеспектакль 21.55 Тэлемагазін 22.00 Ваш стыль 23.15 "Хакей Анатоля Тарасава", д/ф, с. 3

ПОЛЬШЧА-1

07 00 Кава ці гарбата? 09 00 "Мода на поспех". Серыял выть. ЗША. 09 30 Музычная праграма для дзяцей. 09 45 Гімнастыка. 09 50 Мультфільм. 10 00 Навіны. 10 10 Мама і я. 10 25 Дашкольнікі дома. 10 50 Пагаворым аб дзецях. 10 55 Англійская мова для дзяцей. 11 05 "Доктар Квін". Серыял выть. ЗША. 11 55 Музычная праграма. 12 00 Прыемнае з карысным. 12 30 Свет людзей. 13 00 Навіны. 13 10 Аграбізнес. 13 15 Адукацыйнае тэлебачанне. 13 15 Сельскагаспадарчая праграма. 13 40 Школы ў Еўропе. 14 05 Зялёным уверх. 14 35 Стол мудрасці. 15 00 Барацьба за гены. 15 10 І цела, і дух. 15 30 Ніша. 15 50 Праграма на вечар. 16 00 Музычная праграма. 16 30 Для моладзі. 17 00 "Мода на поспех". Серыял выть. ЗША. 17 25 Гімнастыка розума. 17 35 Тэлетурнір. 18 00 Тэлеэкспрэс. 18 20 Публіцыстычная праграма. 19 10 Серыял выть. Англіі. 19 40 Гісторыя польскага тэлебачання. 20 00 Вечарынка. 20 30 Навіны. 21 10 Тэлетэатр. 22 45 Пульс дня. 23 05 Публіцыстычная праграма. 23 15 Тыдзень прэзідэнта. 23 25 Мініяцюры. 23 30 Тэлежурнал. 00 00 Навіны. 00 20 "Мадам Дзюбары". Фільм выть. Германіі. 02 30 Музычная праграма.

ПОЛЬШЧА-2

08 00 Панарама. 08 10 Дэнамінацыя. 08 15 Спартыўная праграма. 08 20 Ранішні госць. 08 30 Англійская мова. 08 40 Музычныя навіны. 09 00 Мясцовая праграма. 09 30 Камедыйны серыял. 10 00 Свет жанчын. 10 30 Дакументальны серыял. 11 00 Мультсерыял. 11 25 Тэлетурнір. 11 50 Музычная праграма. 12 50 Кракаўскія легенды. 13 00 Дакументальны серыял. 14 00 Панарама. 14 20 "Чараўнік з вуліцы Вязаў". Серыял выть. ЗША. 15 10 Музычны журнал. 15 55 Прывітанне. 16 00 Мультфільм. 16 30 Сем дзён польскага спорта. 17 00 Апетыт на здароўе. 17 30 Галерэя мастакоў. 18 00 Дакументальны фільм. 19 00 Панарама. 19 10 Мясцовая праграма. 20 00 Тэлетурнір. 20 35 Праграма для дзяцей. 21 00 "Ало, ало". Серыял выть. Англіі. 21 30 Спыненне раслін. 22 00 Панарама. 22 30 Дэнамінацыя. 22 35 "Прыпынак Аляска". Серыял выть. ЗША. 23 25 Дэпартамент мастацтва. 00 00 Дайце знак жыцця. 01 00 Панарама. 01 05 Канцэрт.

АЎТОРАК, 10.01

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00 Фільм-канцэрт 8.55 "Пракажоная", м/ф, с. 4 10.45 "Блукаючыя агеньчыкі", м/ф 12.55 "Мой свет". Асоба 13.05 "Сувенір для пракурора", м/ф 14.35 "Нов і К"-топ-рэвю 15.45 "Навагрудак. Чытаючы Міцкевіча", д/ф 15.55 "Мой свет". Асоба 16.10 Гісторыя. Паўстанне 1863 года на Беларусі 16.40 Мультфільмы 17.15 "Якія мы гаспадары?" 17.40 Тэлеклуб "Удача" 18.00 Навіны 18.10 Музычны антракт 18.25 Навіны (Бі-бі-сі) 19.00 Шоу-прагноз 19.05 Шчырая размова. Аб свабодзе друку на Беларусі. Прамая лінія 20.00 "Маё каханне, мой смутак" 20.35 Калыханка 21.00 Панарама 21.40 Студыя "Палітыка" 21.55 Кліп-канцэрт 22.05 На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. "Мы жадаем шчасця вам..." Сустрэча з Маяй Гугулан. "Павуціна" м/ф, с. 1. Пад купалам Сусвету. Эканамікст

КАНАЛ "АСТАНКІНА"

5.30 Раніца 7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 22.50 Навіны 8.00 "Топа Джыджыа" 8.25 "Дзікая Роза" 9.00 Што? Дзе? Калі? 14.00 Прадпрымальнік 15.00 Вясёлыя ноткі 15.30 Паміж намі, дзяўчынкамі 16.00 Джэм 16.20 "Элен і хлопцы" 16.50 Свет сёння 17.00 Ведзі 17.30 Загадка СБ 17.40 Дакументы і лёсы 17.45, 20.30 Надвор'е 18.00 Гадзіна пік 18.30 "Дзікая Роза" 18.55 Тэма 19.40 Добрай ночы, малышы! 20.00 Час 20.40 З першых рук 20.50 Ралі Парыж — Гранада — Дакар 21.10 "Я родам з дзяцінства", м/ф 23.05 Канал ілюзій 23.50 Прэс-экспрэс

КАНАЛ "РАСІЯ"

7.00, 11.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі 7.20 Зоркі гаворацъ 7.30 Між іншым 8.00 "Следства вядуць Калабкі", мульт 10.20 Гандлёвы дом 10.35 Тэлегазета 10.40 Сялянскае пытанне 11.05, 13.20 Дзелавая Расія 13.45 Выратаванне 911 15.05 Там-там навіны 15.20 Свята кожны дзень 15.30 "Астравок надзеі", д/ф 16.10 Новая лінія 16.50 Кліп-антракт 16.55 Галасы 17.25 Рэпартажы з месцаў 17.35 Ніхто не забыты 17.40 Кінаафіша 17.55 "Ваша права" 18.10 L-клуб 19.25 Падрабязнасці 19.35 "Антуан і Антуанета", м/ф (Францыя) 21.15 ЭКП 21.25 Я — лідэр 21.50 Кліп-антракт 22.30 Рака часу 22.40 Аўтаімгненне 22.45 "Рускі транзіт", м/ф, с. 3

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

12.00, 14.30, 18.30, 21.30 Інфарм ТБ 12.10 Мультфільм 12.20 "Прыэльбруссе". Тэлефільм 12.30, 14.45, 17.50, 19.05 Музычны момант 12.35 "Нямецкая хваля" 13.00 Хуткая дапамога 13.30 "Мануэла", м/ф (Італія), с. 2 14.20 Мультфільм 14.50 "Выключэнні без правілаў", м/ф 16.25 Чароўная лінія 16.40 Па ўсёй Расіі 16.50 Мультфільм 17.10 Тры колы, фаліянт і іншыя... 17.30 Губернскія надзеі 17.55 Мы і банк 18.50 Спорт, спорт, спорт... 19.10 Вялікі фестываль 19.25 "Мануэла", м/ф (Італія), с. 2 20.15 "Старонкі рускага балета" 20.35 Свет мастацтва 21.10 Тэлемагазін 21.20 Тэлеслужба бяспекі 21.45 Спартыўныя навіны 22.00 Ваш стыль 22.05 "Летуценніца" 23.00 "Парыж. Раман аб горадзе", т/ф (Францыя)

ПОЛЬШЧА-1

07 00 Кава ці гарбата? 09 00 "Першыя пацалункі". Серыял выть. Францыі. 09 30 Колеры. 09 50 Праграма для дзяцей. 10 00 Навіны. 10 10 Мама і я. 10 25 Дашкольнікі дома. 10 50 Пагаворым аб дзецях. 10 55 Англійская мова для дзяцей. 11 00 Серыял выть. ЗША. 11 45 Музычная праграма. 12 00 Рына працы. 12 20 Запрашэнне да стала. 12 30 Клуб адзінокіх сэрцаў. 12 50 Хатні юрыст. 13 00 Навіны. 13 10 Аграбізнес. 13 15 Адукацыйнае тэлебачанне. 13 15 Сельскагаспадарчая праграма. 13 40 Кампутарная школа. 13 55 Не толькі дыназаўры. 14 10 Вялікія адкрыцці ў навуцы і тэхніцы. 14 25 Фантастычныя аповесці. 14 40 Лабараторыя. 15 00 Наша Балтыка. 15 15 З гісторыі тэхнікі. 15 30 Тэлекампутар. 15 45 У свеце навукі. 15 50 Праграма дня. 16 00 Музычная праграма. 16 30 Самі пра сябе. 17 00 "Першыя пацалункі". Серыял выть. Францыі. 17 25 Праграма для дзяцей. 18 00 Тэлеэкспрэс. 18 25 Наша шафа. 18 45 Здароўе. 19 05 Мультсерыял. 19 30 Надзвычайны перагляд. 20 00 Вечарынка. 20 30 Навіны. 21 10 "Праз год, калі ўсё будзе добра". Фільм выть. Францыі. 22 50 Пульс дня. 23 05 Дакументальная праграма. 23 15 Сеймограф. 23 25 Лісты пра гаспадарку. 00 00 Навіны. 00 20 Дакументальны фільм. 01 10 Мастацтва - нямастацтва. 01 30 Праграма пра паэзію. 01 40 Польскія танцы. 02 30 Музычная праграма.

ПОЛЬШЧА-2

08 00 Панарама. 08 10 Дэнамінацыя. 08 15 Спорт. 08 20 Ранішні госць. 08 30 Англійская мова. 08 40 Студыя другой праграмы. 09 00 Мясцовая праграма. 09 30 "Як ёсць". Серыял выть. Польшчы. 10 00 Свет жанчын. 10 30 Дакументальны серыял. 11 00 Фільм для дзяцей. 11 25 Тэлетурнір. 11 50 Дакументальны фільм. 14 00 Панарама. 14 20 "Забароненая любоў". Серыял выть. Іспаніі. 15 10 Тэлежурнал. 15 45 У чым справа? 15 55 Прывітанне. 16 00 Фільм для дзяцей. 16 30 Спартыўная студыя. 17 00 Прадстаўленні 80-х гадоў. 17 30 Тэлежурнал. 18 00 Тэлежурнал. 18 10 Розум мае будучыню. 18 40 Каталіцкая праграма. 19 00 Панарама. 19 10 Мясцовая праграма. 20 00 Тэлетурнір. 20 35 Мультсерыял. 21 00 Пытанні пра Польшчу. 21 50 Спартыўная праграма. 22 00 Панарама. 22 30 Дэнамінацыя. 22 35 Экалагічная праграма. 22 45 Рэпарцёры другой праграмы прадстаўляюць... 23 15 "Вароўкі". Фільм выть. Польшчы. 01 00 Панарама. 01 05 "Счаслівы свет". Серыял выть. Тайвань.

СЕРАДА, 11.01

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00 Эканамікст 8.10 Фільм-канцэрт 8.30 "Маё каханне, мой смутак" 9.00 Гісторыя. Паўстанне 1863 года на Беларусі 9.30 "Павуціна", м/ф (Італія), с. 1 10.20 Урокі Наталлі Наважылавай 10.50 Мультфільмы 11.15 "Мой свет". Асоба 11.35 "Легенда аб каханні", м/ф (Індыя) 13.50 Фільм-канцэрт 14.45 Відзьма-нявідзьма 15.50 "Янка Купала. Паклон мой народу за песні", д/ф 16.40 "Мой свет" 17.05 "З глыбінь жывапісу" 18.00 Навіны 18.10 Музычны антракт 18.25 Навіны (Бі-бі-сі) 19.00 Шоу-прагноз 19.05 "Крок". "Пяць зорак" 20.00 "Маё каханне, мой смутак" 20.35 Калыханка 21.00 Панарама 21.40 Студыя "Палітыка" 21.55 Кліп-канцэрт 22.05 На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. "Павуціна", с. 2 (Італія). Пад купалам Сусвету

КАНАЛ "АСТАНКІНА"

5.30 Раніца 7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 22.50, 0.50 Навіны 8.00 "Топа Джыджыа" 8.25 "Дзікая Роза" 9.00 Ты помніш, таварыш 9.30 "Пецькавы трукі", мульт 14.00 Прадпрымальнік 15.00 Паглядзі, паслухай... 15.20 Адказы 16.00 Цін-тонік 16.20 "Элен і хлопцы" 16.50 Свет сёння 17.00 Кампанія "Мір" 17.40, 20.30 Надвор'е 17.45 "Хто ёсць хто. XX стагоддзе". М. Вавілаў 18.00 Гадзіна пік 18.30 "Дзікая Роза" 18.55 "Сельская гадзіна" з Ю. Чарнічэнкам 19.40 Добрай ночы, малышы! 20.00 Час 20.40 Маналог 20.50 Ралі Парыж — Гранада — Дакар 21.05, 24.00 "Анёл ля майго стала", м/ф (Новая Зеландыя) 23.50 Прэс-экспрэс 0.30 Я вам спяю

КАНАЛ "РАСІЯ"

7.00, 11.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі 7.20 Зоркі гаворацъ 7.30 Між іншым 8.00 "Манька", кароткаметражны фільм 8.25 Ключавы момант 8.35 Мультфільмы 9.15 Музычны экспромт 9.30 "Санта-Барбара" 10.20 Гандлёвы дом 10.35 Тэлегазета 10.40 Сялянскае пытанне 11.05, 13.20 Дзелавая Расія 13.45 "Споведзь Дж. Блейк", д/ф 15.05 Там-там навіны 15.20 Свята кожны дзень 15.30 Студыя "Рост" 16.05 Далёкі Усход 16.45 Будні 17.15 Рэпартажы з месцаў 17.25 Аніматэка 17.55 Наваґоднее канфеці 18.25 Свая гульня 19.25 Падрабязнасці 19.35 "Санта-Барбара" 20.30 Даміно М. Баярскага 21.05 Двайны партрэт 22.30 Рака часу 22.40 Аўтаімгненне 22.45 "Скарпіён з'ядае Блізнятаў на снеданне", м/ф (Венгрыя)

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

12.00, 14.30, 18.30, 21.30 Інфарм ТБ 12.10 Мультфільмы 12.30, 14.45, 17.50, 19.05 Музычны момант 12.35 "Нямецкая хваля" 13.00 Хуткая дапамога 13.30 "Мануэла", м/ф (Італія), с. 3 14.20 "Сава", мульт 14.50 "Мы дзіўна сустрэліся", м/ф 16.00 "Патагонія", д/ф 16.15 "Чарцяня N 13", мульт 16.25 Чароўная лінія 16.40 Паверце, Дзед Мароз сапраўдны 17.20 "Падарожжа з песенькай" 17.55 Гістарычны альманах 18.50 Спорт, спорт, спорт... 19.10 Вялікі фестываль 19.25 "Мануэла", м/ф (Італія), с. 3 20.15 "Падаў леташні снег", мульт 20.35 Блеф-клуб 21.10 Тэлемагазін 21.20 Тэлеслужба бяспекі 21.45 Спартыўныя навіны 22.00 Ваш стыль 22.05 "Тэрэза Ракен". Балет 23.15 СКА — "Тарпеда" (Яраслаўль)

ПОЛЬШЧА-1

07 00 Кава ці гарбата? 09 00 "Мода на поспех". Серыял выть. ЗША. 09 30 Музычная праграма. 09 45 Гімнастыка. 09 50 Мультсерыял. 10 00 Навіны. 10 10 Мама і я. 10 20 Дашкольнікі дома. 10 50 Пагаворым аб дзецях. 10 55 Англійская мова. 11 00 "Група адвакатаў". Серыял выть. Польшчы. 11 50 Музычная праграма. 12 00 Ад калыскі да школы. 12 30 Тэлежурнал. 12 55 Наша дзяржава. 13 00 Навіны. 13 10 Аграбізнес. 13 15 Адукацыйнае тэлебачанне. 13 15 Сельскагаспадарчая праграма. 13 40 Мастацтва лялечнага тэатра. 13 55 Музычная праграма. 14 20 Арфаграфія. 14 35 Сустрэча са Станіславам Лемам. 14 55 Усё вакол - музыка. 15 24 Дакументальная праграма. 15 40 Курс для гітарыстаў. 15 50 Праграма на вечар. 16 00 Музычная праграма. 16 30 Маладзёжны журнал. 16 55 Музычная праграма. 17 00 "Мода на поспех". Серыял выть. ЗША. 17 25 Для моладзі. 18 00 Тэлеэкспрэс. 18 20 Тэлетурнір. 18 45 Тэлежурнал. 19 00 "Група адвакатаў". Серыял выть. Польшчы. 20 00 Вечарынка. 20 30 Навіны. 21 10 "Клуб маладых мільярдэраў". Фільм выть. ЗША. 22 45 Пульс дня. 23 20 Дакументальны фільм. 00 00 Навіны. 00 20 "Небяспечнае жыццё". Фільм выть. Аўстраліі. 01 55 Дакументальны фільм.

ПОЛЬШЧА-2

08 00 Панарама. 08 10 Дэнамінацыя. 08 15 Спорт. 08 20 Ранішні госць. 08 30 Курс англійскай мовы. 08 40 Раніца другой праграмы. 09 00 Мясцовая праграма. 09 30 "Усё акрамя кахання". Серыял выть. ЗША. 10 00 Свет жанчын. 10 30 Дакументальны серыял. 11 00 Мультфільм. 11 20 Музычная праграма. 14 00 Панарама. 14 20 "Двое шустрых з Анталі". Серыял выть. Германіі. 15 20 Тэлежурнал. 15 55 Прывітанне. 16 00 Мультфільм. 16 30 Спартыўная студыя. 17 00 Жывёлы вакол нас. 17 30 Маладыя таленты. 18 00 Партрэт. 18 55 Розыгрыш лато. 19 00 Панарама. 19 10 Мясцовая праграма. 20 00 Тэлетурнір. 20 35 Забаўляльная праграма. 21 00 Палітычны каментар. 21 50 Спартыўная праграма. 22 00 Панарама. 22 30 Дэнамінацыя. 22 35 Экспрэс рэпарцёраў. 23 10 Тэатральная студыя. 23 45 "Чортава адукацыя". Фільм выть. Польшчы. 00 15 Тэлежурнал. 01 00 Панарама. 01 05 Забаўляльная праграма.

ЧАЦВЕР, 12.01

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00 Фільм-канцэрт 8.30 "Маё каханне, мой смутак" 9.00 "А старыя людзі казалі...", д/ф 9.20 "Павуціна", т/ф (Італія), с. 2 10.10 Мультфільмы 10.50 "Мой свет". "Жыве на свеце Уля..." 11.15 "Аплявуха, якой не было", м/ф 12.40 "Крок". "Пяць зорак" 13.30 "Забытая мелодыя для флейты", м/ф 15.40 "І прыйдзе дзень". Тэленавела 16.10 Беларуская літаратура. "З любоўю да роднага краю. А. Гарун і яго творчасць" 16.35 "Разумны сабачка Соня", мульт 16.45 "Мой свет". Музычныя навіны 17.05 Абнаўленне. Ці патрэбна займацца палітыкай? 17.25 Дзедка за рэпку. Парады агароднікам 18.00 Навіны 18.10 Музычны момант 18.25 Навіны (Бі-бі-сі) 19.00 Шоу-прагноз 19.05 Дыялогі аб спорце 19.25 Вытокі. Урокі беларускай мовы 19.45 "Сустрэчы на Ражство". Цырымонія ўручэння прэмій года, ч. 1 20.35 Калыханка 21.00 Панарама 21.40 Студыя "Палітыка" 21.55 Кліп-канцэрт 22.05 На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. "Сустрэчы на Ражство". Цырымонія ўручэння прэмій года, ч. 2. Пад купалам Сусвету. "Крок"

КАНАЛ "АСТАНКІНА"

5.30 Раніца 7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 22.50 Навіны 8.00 "Топа Джыджыа" 8.25 "Дзікая Роза" 9.00 У свеце жывёл 9.35 Экслібрыс 14.00 Прадпрымальнік 15.00 Мульцітролія 15.30 На балі ў Папялушкі 16.00 Цін-інтым 16.20 "Элен і хлопцы" 16.50 Свет сёння 17.00 ...Да 16 і старэйшым 17.30 Галасы Расіі. Спявае М. Азаранка 17.40, 20.30 Надвор'е 17.45 "Хто ёсць хто. XX стагоддзе". Чэмберлен 18.00 Гадзіна пік 18.30 "Дзікая Роза" 18.55 Сярэбраны шар 19.40 Добрай ночы, малышы! 20.00 Час 20.40 Масква—Крэмль 21.00 Лато "Мільён" 21.30 Ралі Парыж—Гранада—Дакар 21.40 "Добры кароль Дагобер", м/ф (Францыя—Італія) 23.50 Прэс-экспрэс 24.00 Музагляд 0.40 Аўта-шоу

КАНАЛ "РАСІЯ"

7.00, 11.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі 7.20 Зоркі гаворацъ 7.30 Між іншым 8.00 "лка ў старым доме", д/ф 8.20 Кліп-антракт. Наталія 8.25 Дэпеша 8.55 "Міс Новы год", "Паўночная казка" 9.15 Музычны экспромт 9.30 "Санта-Барбара" 10.20 Гандлёвы дом 10.35 Тэлегазета 10.40 Сялянскае пытанне 11.05, 13.20 Дзелавая Расія 13.45 Выратаванне 911 15.05 Там-там навіны 15.20 Свята кожны дзень 15.30 Студыя "Рост" 16.10 "Пагаслая зорка?" 16.50 Мір і вайна 17.20 Баскетбол. "Дынама" (Масква) — "Паніёніас" (Грэцыя) 18.05 Ніхто не забыты 18.10 Панове-таварышы 18.25 У свеце аўта- і матаспорту 19.25 Падрабязнасці 19.35 "Санта Барбара" 20.30 "Нос". Гумарыстычная праграма 21.05 Надзвычайны канал 22.30 Рака часу 22.40 Аўтаімгненне 22.45 ЭКП 22.55 "Успамінаючы Барселону". Н. Троіцкая прадстаўляе новых оперных зорак

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

12.00, 14.30, 18.30, 21.30 Інфарм ТБ 12.10 Мультфільмы 12.30, 14.45, 17.45, 19.05 Музычны момант 12.35 "Нямецкая хваля" 13.00 Хуткая дапамога 13.30 Урок нямецкай мовы 13.45 Еўрапейскі калейдаскоп 14.10 "Трое на востраве", мульт 14.50 "Палёты ў сне і наяве", м/ф 16.25 Чароўная лінія 16.40 Чалавек на зямлі 17.10 Рознакаляровы сабака 17.30 Дзіцячыя навіны 17.50 Па ўсёй Расіі 18.00 Паказваюць студыі краіны. Калінінград. "Добры дзень, заўтра". 18.50 Спорт, спорт, спорт... 19.10 Вялікі фестываль 19.25 "Афоня", м/ф 21.00 Мультфільм для дарослых 21.10 Тэлемагазін 21.20 Тэлеслужба бяспекі 21.45 Спартыўныя навіны 22.00 Ваш стыль 22.05 Парад парадаў. Музычнае шоу 23.05 Валейбол. "Аўтамабіліст" — "Уніха" (Іспанія)

ПОЛЬШЧА-1

07 00 Кава ці гарбата. 09 00 "Дзіцячае аддзяленне". Серыял выть. Англіі. 09 30 Для дзяцей. 09 45 Гімнастыка. 09 50 Мультсерыял. 10 00 Навіны. 10 10 Мама і я. 10 25 Дашкольнікі дома. 10 50 Пагаворым аб дзецях. 10 55 Англійская мова. 11 05 "Небяспечнае затрыманне". Серіял выть. ЗША. 11 55 Музычная праграма. 12 00 Кулінарная праграма. 12 20 Гэта лёгка. 12 30 Чвэрць гадзіны на экране. 12 45 Жыць бяспечна. 13 00 Навіны. 13 10 Аграбізнес. 13 15 Адукацыйнае тэлебачанне. 13 15 Сельскагаспадарчая праграма. 13 40 Дакументальны фільм. 14 05 Тэлежурнал. 14 20 Жывёлы свету. 14 50 Такі пейзаж. 15 00 Дакументальная праграма. 15 15 Паварот. 15 30 Тэлежурнал. 15 50 Праграма дня. 16 00 Забаўляльная праграма. 16 30 Тэлетурнір. 17 00 "Дзіцячае аддзяленне". Серыял выть. Англіі. 17 25 "Кро". Музычная праграма. 18 00 Тэлеэкспрэс. 18 20 Кіножурнал. 18 40 Такі свет. 19 05 "Доктар медыцыны". Серыял выть. ЗША. 19 30 Каталіцкая праграма. 20 00 Вечарынка. 20 30 Навіны. 21 10 "Небяспечнае затрыманне". Серыял выть. ЗША. 22 05 Толькі ў першай праграме. 22 50 Сатырычная праграма. 23 00 Урадавы журнал. 23 10 Ваенная праграма. 23 25 Пегас. 00 00 Гаспадарчыя навіны. 00 20 Завяшчанне кахання. 01 05 "Падмаскоўныя вечары". Фільм выть. Расіі. 02 35 Музычная праграма.

ПОЛЬШЧА-2

08 00 Панарама. 08 10 Дэнамінацыя. 08 15 Спорт. 08 20 Ранішні госць. 08 30 Англійская мова. 08 40 Музычныя навіны. 09 00 Мясцовая праграма. 09 30 Серыял выть. Англіі. 10 00 Свет жанчын. 10 30 Дакументальны серыял. 11 00 У краіне дыназаўраў. 11 25 Музычная праграма. 14 00 Панарама. 14 20 "Незвычайная просьба Эміліі Альберт". Фільм выть. Францыі. 15 45 Прывітанне. 16 00 "У краіне дыназаўраў". Серыял выть. ЗША. 16 30 Лётны журнал. 17 00 Дакументальная праграма. 17 30 Музычная праграма. 18 00 Дакументальны фільм. 19 00 Панарама. 19 10 Мясцовая праграма. 20 00 Тэлетурнір. 20 35 Клуб пана Рыся. 21 00 Спартыўная студыя. 22 00 Панарама. 22 30 Дэнамінацыя. 22 35 Аўтажурнал. 23 00 "Смерць у Венецыі". Фільм выть. Італіі. 01 15 Панарама. 01 20 Дакументальны фільм.



На тыдзень

ПЯТНІЦА, 13.01

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00 "Звычайнае жыццё доктара Бызова", д/ф 9.00 Беларуская літаратура. "З любоўю да роднага краю. А. Гарун і яго творчасць" 9.25 Тэлесябрына 9.50 "На варце прыроды", д/ф 10.05 Мультфільм 11.20 "Мой свет". Музычныя навіны 11.40 "Прапаў сябар", м/ф 12.50 "Пра тых, хто памятае...", д/ф 13.20 "Узяць жывым", д/ф 15.35 "І пасеяў Бог зямлю". Тэленавела 15.50 Тэлевізійны Дом кіно 17.20 "Пра Ксюшу і Камп'юшу", мульт 17.40 "Каб не страціць святое штосьці..." Відэафільм 18.00 Навіны 18.10 Музычны антракт 18.25 Навіны (Бі-бі-сі) 19.00 Шоу-прагноз 19.05 "Запрашаем на вячоркі" 20.00 Тэлесябрына 20.20 Вясёлы ўік-энд 20.35 Калыханка 21.00 Панарама 21.40 Студыя "Палітыка" 21.55 Кліп-канцэрт 22.05 На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь; "Павуціна", с. 3 (Італія); Пад купалам Сусвету; Эканамікст; "Зорка з зоркаю гаворыць..." Шоу-праграма; "Бон тон"; "Іронія лёсу, ці з лёгкай парай", м/ф

КАНАЛ "АСТАНКІНА"

5.30 Раніца 7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 22.50 Навіны 8.00 Сарока 8.25 "Дзікая Роза" 9.00 Агарод круглы год 9.30 "Золатавалоска", мульт 14.00 Прадпрымальнік 15.00 Дзесьці на белым свеце 16.00 "Субота і нядзеля", м/ф 16.20 Рок-урок 16.50 Свет сёння 17.00 Чалавек і закон 17.30 У гэтыя дні 50 год назад 17.45, 20.30 Надвор'е 18.00 Бамонд 18.20 "Дзікая Роза" 18.50 Поле цудаў 19.40 Добрай ночы, малышы! 20.00 Час 20.40 Чалавек тыдня 21.00 "Клан", м/ф (Францыя), с. 1 22.00 Ралі Парыж—Гранада—Дакар 22.10 Адзіны дубль 23.25 "Тэлешоу "50 x 50" 23.50 Прэс-экспрэс 24.00 Тэлешоу "50 x 50"

КАНАЛ "РАСІЯ"

7.00, 11.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Весткі 7.20 Зоркі гавораць 7.30 Між іншым 8.00 Мультфільм 8.20 Ключавы момант 8.30 Рэтра-шлягер 9.00 Мультфільмы 9.30 "Санта-Барбара" 10.20 Гандлёвы дом 10.35 Тэлегазета 10.40 Сялянскае пытанне 11.05, 13.20 Дзелавая Расія 13.45 Музычная праграма 15.05 "Ілка ў Крамлі" 16.10 Новая лінія 16.50 "Ніхто не забыты" 16.55 "Гномамабіль", м/ф 18.25 "Саткілава прадстаўляе..." 19.25 Падрабязнасці 19.35 "Санта-Барбара" 20.30 Сам сабе рэжысёр 21.05 "К-2" прадстаўляе: "Нюі" 22.30 Рака часу 22.40 Аўтаімгненне 22.45 Аншлаг і Ко 0.15 "Сэкс-місія", м/ф

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

12.00, 14.30, 18.30, 21.30 Інфарм ТБ 12.10 Стары Новы год 12.30, 14.45, 17.55 Музычны момант 12.35 "Нямецкая хваля" 13.00 Хуткая дапамога 13.30 Фільм-канцэрт 14.50 "Афоня", м/ф 16.25 Чароўная лінія 16.40 Дзецям пра звяранят 17.10 Паласатая музыка 18.00 Храм 18.50 Спорт, спорт, спорт... 19.00 Тэлемагазін 19.05 Вялікі фестываль 19.25 "Тэатр мадэмуазель Клерон". Тэлеспектакль 21.20 Тэлеслужба бяспекі 21.45 Спартыўныя навіны 22.00 Ваш стыль 22.05 "На біс" 22.35 На ноч глездзячы 23.05 "Помста маленькіх вядзьмарак-іншапланецянак", м/ф (ЗША) 0.35 Зоркі ў карнавале 1.10 "Арт"-буфет

ПОЛЬШЧА-1

07 00 Кава ці гарбата. 09 00 "Мода на поспех". Серыял вытв. ЗША. 09 30 Для дзяцей. 09 55 Гімнастыка. 10 00 Навіны. 10 10 Мама і я. 10 25 Дашкольныя дома. 11 00 "Вяртанне Маклейна". Серыял вытв. ЗША. 11 50 Музычная праграма. 12 00 Школа для бацькоў. 12 15 Пашый сама. 12 30 У сябе. 13 00 Навіны. 13 10 Аграбізнес. 13 15 Адукацыйнае тэлебачанне. 13 15 Сельскагаспадарчая праграма. 13 45 Трансплантацыя. 14 00 Дакументальны фільм. 14 25 Якая школа? 14 35 Інваліды. 14 50 Якія мы. 15 05 Тэлежурнал. 15 20 Бізнес па-амерыканску. 15 50 Праграма дня. 16 00 Чэмпіянат свету па танцах. 16 30 Дакументальны фільм. 16 55 Музычная праграма. 17 00 "Мода на поспех". Серыял вытв. ЗША. 17 25 Праграма для дзяцей. 18 00 Тэлеэкспрэс. 18 20 Тэлежурнал. 18 30 Штотыднёвік культуры. 18 40 Тэлежурнал спажыўца. 19 05 Спатканне ўцёмную. 19 50 Сатырычная праграма. 20 00 Вечарынка. 20 30 Навіны. 21 10 "Начны каўбой". Фільм вытв. ЗША. 23 05 Пульс дня. 23 30 Забаўляльная праграма. 00 00 Навіны. 00 15 Тэлежурнал. 00 30 Блізкія сустрэчы. 01 05 "Амерыканскі хлопчык". Фільм вытв. Украіны. 02 55 Чэмпіянат свету па танцах.

ПОЛЬШЧА-2

08 00 Панарама. 08 10 Дэнамінацыя. 08 15 Спорт. 08 20 Раніцні госць. 08 30 Курс англійскай мовы. 08-40 Музычныя навіны. 09 00 Мясцовая праграма. 09 30 Камедыйны серыял. 10 00 Свет жанчын. 10 30 Дакументальны фільм. 11 00 Мультсерыял. 11 25 Музычная праграма. 14 00 Панарама. 14 20 "Зоў крыві". Фільм вытв. Англіі. 16 00 Мультсерыял. 16 25 Прывітанне. 16 30 Спартыўная студыя. 17 30 "Ад дзевяці да пяці". Камедыйны серыял вытв. ЗША. 18 00 Дакументальны фільм. 18 40 Пра фільм. 19 00 Панарама. 19 10 Мясцовая праграма. 20 00 Адзін з дзесяці. 20 35 Музычная праграма. 21 00 Публіцыстычная праграма. 21 50 Спартыўная праграма. 22 00 Панарама. 22 30 Дэнамінацыя. 22 35 Другая праграма. 22 40 Забаўляльная праграма. 23 15 "Форт Саагіне". Фільм вытв. Францыі. 01 00 Панарама. 01 05 Класікі рока.

СУБОТА, 14.01

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.00 "Такія розныя клоўны". Канцэртная праграма 8.50 Эканамікст 9.00 Здароўе 9.20 "Барбі-лата" 9.50 "Лулу — анёл кветак" 10.25 "Тэлебом" 11.25 "Што ні край, то свой звычай" 12.00 "Паміж намі, жанчынамі..." 12.50 "Сітуацыя" 13.35 Аўта-парк 13.50 "Цёмны пакой" 14.15 Мост 14.45 "Опера ў аперэце". Г. Даніцэці. Опера "Віва ля Мама" 15.25 Тэлекрама 15.35 "Джэнтльмены ўдачы", м/ф 17.00 "Етвызь-94". Фінал 18.55 "Чакалі свята..." 25 гадоў — творчаму аб'яднанню "Энцыклапедыя" 19.45 Шоу-прагноз 19.50 Міжнародныя спартыўныя навіны 20.20 Вясёлы ўік-энд 20.35 Калыханка 21.00 Панарама 21.40 "Акалада". Муз. праграма 22.25 "Бабнік", м/ф 23.40 Пад купалам Сусвету 23.50 Відэма-нявідзьма 0.50 "Салодкія мроі", м/ф (ЗША)

КАНАЛ "АСТАНКІНА"

6.30 Раніца дзелавога чалавека 7.15 Спортшанц 7.45 Слова пастара 8.00 Покліч джунгляў 8.30 Тэлерадыёкампанія "Мір" 10.00 Раніцняя пошта 10.30 Медыцына для цябе 11.00 Без паўзы 11.10 Смак 11.25 Люстэрка 12.00 "Краса і гонар Расіі" 12.30 Сустрэчы для вас. Ч. Айтматаў 13.05 Грай, гармонік! 13.50, 22.50, 23.50 Навіны 14.00 Дыялог у прамым эфіры 14.35 Фолк-клуб "Рыжая трава" 15.05 "Жыццё заапаркаў" 15.50 Брэйн-рынг 16.40 Да і пасля... 17.40 "Спатканне з незнаёмкай", м/ф (ЗША) 19.40 Добрай ночы, малышы! 20.00 Час 20.35 Надвор'е 20.45 Ралі Парыж—Гранада—Дакар 21.00 Смехапанарама. Вядучы — Я. Петрасян 21.50 Хіт-парад "Астанкіна"

КАНАЛ "РАСІЯ"

7.00, 13.00, 19.00, 22.00 Весткі 7.20 Зоркі гавораць 7.30 Здарова жывеш 7.45 Студыя "Рост" 8.15 Пілігрым 9.00 Парламенцкі тыдзень 9.45 "Снеданне для чэмпіёнаў" 10.15 Як жыць будзем? 11.00 Тэлеэрудыт 11.05 "Мая марачка" 12.20 Мульці-пульці 12.40 Сялянскае пытанне 13.20 Дэ факта 13.35 "Эдэра" 14.25 "Спынены вальс", д/ф 14.45 Футбол без межаў 15.30 Белая варона 16.15 Зоркі Амерыкі 16.45 Тэлеэрудыт 16.50 Свята кожны дзень 17.00 "Выкрадзены", м/ф (ЗША) 17.55 Багема. Л. Палішчук 19.25 "Вясельнае падарожжа", м/ф (Францыя) 20.55 Кліп-антракт 21.05 Зусім сакрэтна 22.30 Рака часу 22.40 Аўтаімгненне 22.45 Праграма "А" 23.45 "Нелюбоў", м/ф

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

6.30 Рэлігійная праграма 7.00 Тэлеканал "Добрай раніцы" 10.00 Чароўная лінія 10.15 Я і мой сабака 10.30 "Аб'ектыў", д/ф 11.20 Музыка на заказ 11.50 "Дзіцячы патруль", м/ф 13.00 Хуткая дапамога 13.40 "Раба кахання", м/ф 15.15 Парады садаводам 15.25 "Музей д'Орсэ", т/ф (Францыя) 16.15 Мультфільмы 16.35 Цыркавая праграма 16.55 Казка за казкай 17.40 Экспрэс-кіно 17.55, 21.20 Уік-энд з дэтэктывам 18.30, 21.30 Інфарм ТБ 18.55 Эканоміка і мы 19.10 Вялікі фестываль 19.30 "Нана", м/ф, с. 1 (Францыя) 20.35 Нестар Хэдавей у Пецярбурзе 21.45 Ваш стыль 21.55 Тэлеканал "Не хочаш — не глядзі" 23.05 Баскетбол. "Спартак" — "Урал" (Екацярынбург) 23.40 "Італьянскі кантракт", м/ф

ПОЛЬШЧА-1

08 00 З Польшчы. 08 10 Экалагічная праграма. 08 25 Усё аб агародзе. 08 50 Агралінія. 09 30 Спартыўная аптэка. 09 55 Праграма дня. 10 00 Навіны. 10 10 Праграма каталіцкай рэдакцыі для дзяцей. 10 35 Праграма для дзяцей. 12 20 Лета пінгвіноў. 12 50 Тэлежурнал. 13 00 Навіны. 13 10 Тэлежурнал. 13 35 Праграма для моладзі. 14 05 Тэлежурнал. 14 30 Мультфільмы У. Дыснея. 15 45 Тэлежурнал. 16 25 Канцэрт. 16 50 Жывёлы свету. 17 25 "Сямейнае прадпрыемства". Серыял вытв. Польшчы. 18 00 Тэлеэкспрэс. 18 25 Тэлежурнал. 18 50 Тэлежурнал. 19 10 "Беверлі Хілз". Серыял вытв. ЗША. 20 00 Вечарынка. 20 30 Навіны. 21 00 "Калейдаскоп". Фільм вытв. ЗША. 22 55 Чар-пар. 00 20 Навіны. 00 30 Спартыўная субота. 00 45 "Снайпер". Фільм вытв. ЗША. 02 15 "На паўночна-заходнім шляху". Фільм вытв. Францыі. 03 45 Музычная праграма.

ПОЛЬШЧА-2

08 00 Панарама. 08 10 Музыкальная раніца. 08 30 Такія адзінокія. 08 50 Урок мовы глуханямых. 08 55 Прывітанне. 09 00 Музычны рэпартаж. 09 30 Мультфільм. 10 00 Мясцовая праграма. 11 00 Армії свету. 11 30 Польскія манастыры. 12 00 Праграма для дзяцей. 13 00 "Ілюмінацыя". Фільм вытв. Польшчы. 14 35 Тэлежурнал. 15 00 Народны смак. 15 30 Жыццё побач з намі. 15 55 Культурна-публіцыстычная праграма. 16 15 Студыя другой праграмы. 16 25 Прывітанне. 16 30 "Хартовы на дзкім Захадзе". Серыял вытв. ЗША. 17 30 Тэлетурнір. 18 00 Тэлепрадстаўленне. 18 55 Розыгрыш лато. 19 00 Панарама. 19 10 Мясцовая праграма. 19 30 Сем дзён - свет. 20 00 Тэлетурнір. 20 35 Праграма для дзяцей. 21 00 Забаўляльная праграма. 22 00 Панарама. 22 30 Слова на нядзелю. 22 35 Музычны журнал. 23 05 "Заўсёды супраць ветру". Фільм вытв. ЗША. 00 40 Спартыўная студыя. 01 00 Панарама. 01 05 Канцэрт.

НЯДЗЕЛЯ, 15.01

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

7.55 Фільм-канцэрт 8.55 "Спортпляцоўка" 9.15 Добрыя весткі 9.25 Урокі Наталлі Наважылавай 9.55 Свята дзіцячай моды 10.20 "Уся справа ў капелюшы" 10.50 "Тэлебом" 12.05 "Планета людзей". Па матэрыялах тэлеканала "Уорлднет" (ЗША) 12.25 Архіварыус. "Зоркі беларускай оперы. Ларыса Александроўская" 12.55 "Казка у гарах" 13.15 Стужка ўспамінаў. Прадстаўляе творчае аб'яднанне "Тэлефільм" 13.55 "Беларускі карагод" 14.50 "Пасля 2000 года". Серыял (Аўстралія) 15.50 Анталогія гумару 16.25 Тэлеклуб "Гаў-гаў" 17.10 Тэлекрама 17.20 "Элегія", д/ф 17.40 Творчы вечар паэта Г. Бураўкіна 19.45 Праспект 20.15 Вясёлы ўік-энд 20.30 Калыханка 20.50 Шоу-прагноз 21.00 Панарама 21.40 Пад купалам Сусвету 21.50 "Касмічныя прышэльцы", мульт; "Няхай памрэ звер", м/ф

КАНАЛ "АСТАНКІНА"

7.20 Алімпійская раніца 7.50 Спортлато 8.00 Марафон-15 8.30 Раным-рана 9.00 Палігон 9.30 Пакуль усе дома 10.00 Раніцняя пошта 10.50 Пад знакам "пі" 11.35 "Вясёлка". Выступленне фальклорных груп (Венгрыя) 12.15 Эканоміка і рэформы 12.45 "Шпаргалка" з падарункам 13.00 Сусветная геаграфія: сакрэты "Цітаніка" 13.50, 17.00, 22.50, 24.00 Навіны 14.00 "Стратэгія Перамогі", д/ф, с. 15 14.55 Жывое дрэва рамёстваў 15.05 Клуб падарожнікаў 16.00 Ралі Парыж—Гранада—Дакар 16.30 Акно ў Еўропу 17.10 Мультсерыялы (ЗША) 18.10 Малыя гарады Расіі. г. Электрасталь 18.45 Надвор'е 18.55 "Цот і лішак", м/ф (Італія) 21.00 Нядзеля 21.50 Спартыўны ўік-энд. Ралі Парыж—Гранада—Дакар 22.05 Тэлелоцыя 22.20 Вакзал мары. Ю. Башмет 23.20 Каханне з першага погляду 0.15 У свеце джаза

КАНАЛ "РАСІЯ"

7.00, 13.00, 19.00, 22.00 Весткі 7.20 Зоркі гавораць 7.30 Студыя "Рост" 8.00 Мульці-пульці 8.10 Кліп-антракт 8.15 Казкі для бацькоў 8.45 Наш сад 9.15 Канцэрт рок-спявачкі Шэр 9.45 Аты-баты... 10.15 Рускае лата 11.00 "Машачка", м/ф 12.20 Мульці-пульці 12.40 Сялянскае пытанне 13.20 Не высечы... 13.35 "Эдэра" 14.25 Сем нот у цішыні 14.55 Мульці-пульці 15.05 Лепшыя гульні НБА 16.05 "Гарыла", д/ф 17.00 Чароўны свет Дыснея 18.00 Свята кожны дзень 18.10 Каробка перадач 18.25 У Ксюшы 19.25 Н. Русланава і С. Любшын у фільме "Сустрэча", А. Сафонава ў фільме "Тайна зямлі" 20.25 "Бессмяротны ў памяці рускай..." Святочны вечар, прысвечаны 200-годдзю з дня нараджэння А. Грыбаедава 22.30 Рака часу 22.40 Аўтаімгненне 22.45 "Гэта старая, старая казка". Баль у Санкт-Пецярбурзе

САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ

6.30 Гаючае слова 7.00 Тэлеканал "Добрай раніцы" 10.00 Чароўная лінія 10.15 "Паглядзім" 10.30 Рандэву. Юрый Шачук 11.00 Нядзельны лабірынт 12.35 Экспрэс-кіно 12.50 "Ну, пачакай!", мульт 13.30 Этнасы Зямлі 14.00 Класіка-5. "У гонар балетманаў" 15.25 Чэмпіянат Італіі па футболе 17.25 Вакол антэны. Па матывах года 17.55 Мультфільм 18.05 Залаты ключ 18.20 Зебра 19.05 Рэтра-канцэрт 19.30 Інфарм ТБ 19.50 "Поезд у Каліфорнію", м/ф 21.35 "Паглядзім" 21.50 Ваш стыль 22.05 "Батэрфляй", д/ф 23.00 Адам і Ева +

ПОЛЬШЧА-1

08 00 Сельская гаспадарка ў свеце. 08 15 Далёка і блізка. 08 30 Нядзеля. 09 00 Сельскагаспадарчая праграма. 09 25 Праграма дня. 09 30 Нядзельная кінапраграма. 09 55 Тэлераніца. 10 20 Музычная скрыня. 10 50 Фільм для дзяцей. 11 15 Тэлетэатр для дзяцей. 12 00 Навіны. 12 10 Дакументальны фільм. 13 00 Тэлеканцэрт пажаданняў. 13 30 З камерай сярод звяроў. 13 45 Цырк фізікаў. 14 05 За сям'ю гарамі. 14 40 У старым кіно. 16 05 Забаўляльная праграма. 16 30 Публіцыстычная праграма. 17 00 Антэна. 17 20 Вочы ў вочы. 18 00 Тэлеэкспрэс. 18 25 Варта пасмяяцца. 19 05 "Доктар Квін". Серыял вытв. ЗША. 20 00 Вечарынка. 20 30 Навіны. 21 10 Серыял вытв. ЗША. 22 05 Спартыўная нядзеля. 22 30 Дакументальны серыял. 22 50 Публіцыстычная праграма. 23 20 Вечар з Аліцыяй. 00 20 "Прабачце, тут б'юць?". Фільм вытв. Польшчы. 01 45 Дакументальны фільм.

ПОЛЬШЧА-2

08 00 Рэха тыдня. 08 30 Фільм для глухіх. 09 20 Слова на нядзелю. 09 25 Канцэрт. 09 30 Згуртаванне ў культуры. 10 00 Мясцовая праграма. 11 00 Канцэрт. 12 00 Гадзіна з Ханнай Барбарай. 13 00 "Сын Робін Гуда". Фільм вытв. Англіі. 14 20 Другая праграма. 14 30 Спартыўная студыя. 15 05 Падарожжа ў часе і прасторы. 15 55 "Пам Магоо". Серыял вытв. Канады. 16 00 Музычная праграма для дзяцей. 16 45 Айчына. 17 00 "Як ёсць". Серыял вытв. Польшчы. 17 30 Тэлетурнір. 18 00 Шанц на поспех. 19 00 Падзеі тыдня. 19 25 Спартыўная студыя. 19 50 Мясцовая праграма. 20 00 Тэлетурнір. 20 35 Мульсерыял. 21 00 Спецыяльная лінія. 22 00 Панарама. 22 30 Краіна смеху. 23 25 "Квін". Серыял вытв. ЗША. 00 15 Тэлетэатр. 01 00 Панарама. 01 05 Зоркі сусветнага джазу.

ІНФАКАЛАЖ

НЕ ХАПАЕ ІНТЫМУ

Паліцэйскі Дэніэл Аткінсон з амерыканскага горада Нью-Джэрсі, прыйшоўшы пасьля службы дадому, стрэліў сабе ў галаву з табельнай зброі. Учынак Дэніэла - гэта 11-ты выпадак самазабойства паліцыянтаў у ЗША ў гэтым годзе.

Усяго за апошнія дзесяць год у ЗША "добраахвотна" пакінулі жыцьцё 66 паліцыянтаў.

Кіраўніцтва, разгубленае такой колькасьцю самагубстваў, запрасіла да працы псіхааналітыкаў. Першыя досьледы паказалі, што амерыканскім паліцыянтам не хапае інтыму ў сямейным жыцьці.

МЕТАД ВЫХАВАНЬНЯ ДОБРАГА ГУСТУ

Старшыня камісіі па справах жанчын у парламенце Зімбабвэ Рут Чынамана заклікала суайчыньніц у пытаньнях гігіены і аховы здароўя выконваць свае супружніцкія абавязкі толькі тады, калі муж штодня чысьціць зубы і хоць раз на тыдзень прымае ванну.

КІЙ ЯК СРОДАК ВЫХАВАНЬНЯ

Міністэрства адукацыі Сінгапура выпусьціла новую інструкцыю для настаўнікаў. Сэнс інструкцыі: не скупіцца скарыстоўваць кій як сродак выхаваньня навучэнцаў.

ЗША - КРАІНА АПТЫМІСТАЎ

90 працэнтаў жыхароў ЗША лічаць сябе веруючымі, а 75 - лічаць, што ёсьць пекла і рай.

Аднак, кожны з амерыканцаў не траціць аптымізму, бо спадзяецца, што трапіць у рай.

ВОСЬ ДЫК ЗАКОНЫ

35-гадовая Марыя Грацыя Майо за дзевяць год сваёй працы на пошце Турына знаходзілася пры выкананьні службовых абавязкаў усяго дзевяць дзён. Астатні час жанчына была ці ў адпачынку па цяжарнасьці, ці на платных студыях, што абавязкова дзяржаўным служачым, ці хварэла.


Кіраўніцтва ахвотна звольніла б Марыю з працы, але, на жаль апошніх, яна ніводнага разу не зрабіла прагула па сваёй віне.

БУЙНЕЙШЫЯ ГАРАДЫ ДА 2000 ГОДА

Інстытут эканомікі і разьвіцьця градабудаўніцтва, што існуе пры ААН, апублікаваў навуковыя дадзеныя па росту насельніцтва ў буйных гарадах нашай планеты да 2000 года:

1. Мехіка (Мексіка) - 25 млн. жыхароў; 2. Сан-Паулу (Бразілія) - 22, 1 млн.; 3. Токіа (Японія) - 19,0 млн.; 4. Шанхай (Кітай) - 17,0 млн.; 5. Нью-Йорк (ЗША) - 16,8 млн.; 6. Калькута (Індыя) - 16,7 млн.; 7. Бамбей (Індыя) - 15,4 млн.; 8. Пекін (КНР) - 14,0 млн.; 9. Лос-Анджэлес (ЗША) - 13,9 млн.; 10. Джакарта (Інданезія) - 13,7 млн.

(З.Д.)



СПАРТЫЎНЫ КАЛЕЙДАСКОП

ГАРАДЗЕНЦЫ СЯРОД ЛАЎРЭАТАЎ

Федэрацыя па водных відах спорту Рэспублікі Беларусь падвяла вынікі выступаў беларускіх ветэранаў на міжнароднай арэне і вызначыла сярод спартсменаў і трэнераў па пяць лепшых.

Сярод спартсменаў лепшым аказаўся і гарадзенскі плавец Максім Жураўлёў, які летась стаў бронзавым прызёрам чэмпіянату Эўропы сярод моладзі.

Трэнер Максіма, Аляксандр Аўдзееў, таксама ў сьпісе лаўрэатаў федэрацыі.

Г.В.

«ЛІДЧАНЕ» Ў МЕНСКУ

28 сьнежня перыферыйная Ліда зрабіла навагодні падарунак Менску.

Справа ў тым, што ў Палацы мастацтваў сталіцы адкрылася выстава творчага аб'яднаньня "Лідчане" 14-й сярэдняй школы г.Ліды.

Адбылася ўнікальная падзея. Упершыню ў гісторыі Палаца мастацтваў тут выстаўлялася адна школа. Ды яшчэ з раённага цэнтру, няхай сабе і такога славутага, як Ліда.

На прэзентацыі, якая пачалася ў 13.00 гадзін, прысутнічалі прадстаўнікі міністэрстваў культуры і адукацыі, Саюза мастакоў Беларусі, кіраўнікі Ліды і Лідзкага раёна, спонсары выставы. Песьнямі, музычнымі кампазіцыямі аздаблялі прэзентацыю навучэнцы Лідзкага музычнага вучылішча.

С.СУДНІК.

ПАКУЛЬ ШТО ТРЭЦІЯ

У апошні дзень старога года, нягледзячы на перадсьвяточныя клопаты, прайшлі чарговыя гульні гарадзкога турніра па мініфутболу. "Пагоня" у гэтым туры здабыла 1 ачко, згуляўшы ўнічыю з камандай "Хімвалакно-2". Лік сустрэчы - 2:2. Абодва галы для "Пагоні" здабыў А.Калошыц. Можна адзначыць таксама неблагую гульню варатара С.Ленца.

Зараз "Пагоня" мае 8 ачкоў і займае 3-е месца ў турнірнай табліцы.

М.БЕЛАКОЗ.

КЭШ ВЯРТАЕЦЦА

Ветэран аўстралійскага тэнісу Пэт Кэш паспрабуе вярнуцца ў вялікі тэніс пасьля складанай аперацыі на сухажыльлі.

Падрыхтоўку да галоўнага матча сезона, адкрытаму першынству Аўстраліі, што залічаны да серыі "Вялікага шлему", Кэш распачне з выступу на невялікім паўпрафесійным турніры "Калоніял мьючуал класік", які адбудзецца ў сярэдзіне студзеня.

Праўда, кампанія на турніры вельмі вядомая - гэта Піт Сампрас, Стэфан Эдберг, Міхаэль Штых, Майкл Чанг, Барыс Бэкер.

Г.Г.

НЕПРЫЧЭСАНЫЯ ДУМКІ

І пуга пускае парасткі, калі трапіць у спрыяльную глебу.

Карлікам трэба нізка кланяцца.

Няведаньне закона не вызваляе ад адказнасьці, затое веданьне - часта.

Акно ў сьвет можна закрыць газетай.

Сны залежаць ад становішча сьпячага.

Сатыра ніколі не можа здаць экзамен: у журы сядзяць яе аб'екты.

У кожным стагоддзі ёсьць сваё сярэдневечча.

Сумленьне ў яго чыстае. Не было ў выкарыстаньні.

Не закрывай рот тым, хто расплюшчвае табе вочы.

Самая азартная з ваенных гульняў - гульня ў дэмакратыю.

(Л.С.)

ПІЦЬ ТРЭБА МЕНЕЙ

Штраф памерам 23 тысячы лір павінен заплаціць 50-гадовы інжынер Паола Раджыні за тое, што яго сабачка наталіла прагу з фантана рымскай вілы Тарлонія.

На бяду гаспадара, непадалёк фантана патрулявалі паліцыянты, якія зьдзейсьнілі затрыманьне на месцы злачынства.

Дарэчы, муніцыпалітэт Рыма прыняў нядаўна закон аб забароне ўжываць ваду для піцьця з фантанаў сталіцы, якія зьяўляюцца яе гонарам.

(з.д.)

КРЫМІНАЛЬНАЯ ХРОНІКА

НОЧКА ЦЁМНАЯ ПРЫЙШЛА...

Пярэдадзень Новага года не абыйшоўся без шэрагу цяжкіх злачынстваў, учыненых, вядома ж, у нецьвярозым стане. Сцэнары гэтых, у асноўным кухонных, паядынкаў падобныя, як блізьняты.

У в.Цацкі Лідзкага раёна трагічнае непаразуменьне за чаркаю ўзьнікла паміж бацькам і сынам. У выніку 30-гадовы сын з траўмаю галавы памёр у бальніцы.

У в.Васкрысенка на Ашмяншчыне вячэрняя разборка паміж "вясёлымі" мужам і жонкай таксама скончылася лятальным зыходам: 40-гадовы мужчына памёр на месцы ад вялікай страты крыві, калі атрымаў ад "спадарожніцы жыцьця" нажавое раненьне левага бядра.

У Горадні ў доме па вул.Горкага класічны "міжсабойчык" адбыўся паміж цесьцем і зяцем. У выніку 56-гадовы пенсіянер пакінуў на месцы здарэньня паміраючага ад удара ў сэрца сваяка і паспрабаваў уцячы, але праз чатыры гадзіны быў затрыманы.

ШЭРАГІ РЭКЕЦІРАЎ РАДЗЕЮЦЬ

У Лідзе двое юных "ракетчыкаў" уключылі "лічыльнік" для навучэнца індустрыяльнага тэхнікума. Але не давялося ім пакарыстацца сотняй "зялёных", якія былі ім перададзены, бо адразу пасьля гэтага абодва апынуліся ў цесных "абдымках" мясцовага АБАЗа.

АДКУЛЬ "МАСЬЛЯКІ"?

Пэўна, ужо нідзе не працуючаму 30-гадоваму жыхару Ліды давядзецца падрабязна растлумачыць сьледчаму не толькі аб паходжаньні самаробнага нагана, але і аб васьмі патронах.

ЗАКОН І ВЕРА

Здаецца, калі чалавек не верыць у Бога, то толькі страх пакараньня зможа спыніць яго ад бязьлітаснага ўчынку. На жаль, аднак, і яго Вялікасьць Закон не змог абараніць жыцьцё нямаладзі ў в.Кальчуны Ашмянскага раёна,якое загінула ад рук уласнай маці.

ВАНДАЛЫ НА МОГІЛКАХ

Відаць, не апраўдала спадзяваньні бандытаў захаваньне 83-гадовага жыхара вёскі Полбераг на Наваградчыне. Ускрытая труна ніякім чынам не палепшыла матэрыяльны дабрабыт трунакапальнікаў. А вось іх сумленьне - наўжо не загаворыць?

...І ЛЯ ЦАРКВЫ

Нават блізкасьць Пакроўскай царквы не выратавала ад бязьлітаснай сякеры тры цудоўныя блакітныя елкі, што расьлі каля будынка "Гродноаблаўтатранса" па вул.Ажэшка.

Так і цягне крыкнуць: "Каб вам рукі..."

ДЗЮБЕЛЕМ У СЭРЦА

Бадай упершыню ў трагічнай статыстыцы Гарадзеншчыны дзеля самагубства ўжыты будаўнічы пісталет. За трое сутак да Новага года яго скарыстаў у сваёй кватэры па вул.Горкага 58-гадовы інжынер электра-мантажнага трэста.

ПАЛЁТ ЛЯ "КАМЕТЫ"

Калі двое супрацоўнікаў лідзкай міліцыі заўважылі ноччу на даху новабудоўлі падазронага мужчыну , той кінуўся ўцякаць. Яно і не дзіўна, бо побач знаходзілася камерцыйная крама "Камета". Але ўцячы злодзей не змог - упаў з даху. "Палёт" скончыўся няўдала: зламысьнік атрымаў пры гэтым некалькі цяжкіх цялесных пашкоджаньняў.

Г.СЫСОЙ.

НОЧ ПАД НОВЫ ГОД

Замкнула зямля свой ящчэ адзін круг,
Другі зачынае.
Маўчыць непрытульна засьнежаны луг
І пушча лясная.
Мігаюць далёкія зоркі ўгары,
Як чыстыя росы.
І ходзіць паважна мароз па бары,
Злы, белавалосы.
Глядзіць неласкава скляпеньне нябёс
На скутую землю,
У Млечнага Шляху паблеклы пракос
У холадзе дрэмле.
У гэтым зьмярцьвеньні начной цішыні
Год новы вітаю.
- Якою пуцінай вы пойдзеце, дні?
- Я моўчкі пытаю.
Маўчыць неабсяжны прастор-глыбіня
Без берагу-краю.
Маўчыць з ім і постаць наступнага дня.
І я замаўкаю.

Якуб КОЛАС.

КРУПЕНКУ ПАДТРЫМАЛІ ЎСЕ, ГУДЗЕЯ - БОЛЬШАСЬЦЬ

3 студзеня прайшла сесія Гарадзенскага гарадзкога Савета народных дэпутатаў. Асноўным пытаньнем, якое разглядалася на ёй, было прызначэньне старшыні выканаўчага камітэта.

Са згоды Прэзідэнта Беларусі старшыня Гарадзенскага аблвыканкама прапанаваў на гэтую пасаду кандыдатуру ранейшага мэра горада Г.А.Крупенку. Дэпутаты аднагалосна і без абмеркаваньня падтрымалі яе.

На сесіі быў таксама абраны новы старшыня гарсавета. Пераважная большасьць дэпутатаў шляхам тайнага галасаваньня выказала падтрымку Ф.П.Гудзею, былому начальніку ўпраўленьня ўнутраных спраў Гарадзенскага аблвыканкама. Цікава, што першыя свае словы на новай пасадзе ён сказаў на расейскай мове.

ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

"Пагоня" паведамляла, што ў Горадні прайшоў чарговы аўкцыён па продажу аб'ектаў камунальнай уласнасьці. На таргі выстаўлялася ўсяго чатыры лоты (напэўна, арганізатары аўкцыёна ўлічылі, што толькі на двух папярэдніх з 18 і 11 аб'ектаў, што выстаўляліся на іх, тры і пяць адпаведна былі зьняты з таргоў). Аўкцыён не выклікаў вялікай зацікаўленасьці ў дзелавых людзей: на кожны з аб'ектаў прэтэндавала 2-3 чалавекі. Але ж амаль усе былі прададзены за нядрэнныя грошы.

Самай дарагой аказалася крама "Мотавела" па вул.Белуша. Пры пачатковай цане 87,5 мільёна рублёў яна была прададзена ва ўласнасьць за 800 мільёнаў. Астатнія аб'екты набываліся на правах арэнды.

Тэрмінам на 10 гадоў з умовай захаваньня профілю прадпрыемства на пяць год і кольказьці працоўных месцаў на два гады новы ўласьнік атрымаў краму "Валошка" па вул.Горкага (стартавая цана - 18,6 мільёна рублёў, прадажная - 42 мільёна). На такі ж тэрмін з аналагічнымі ўмовамі быў прададзены кактэйль-бар "Ручаёк". Продажны кошт яго перавысіў пачатковы (5 мільёнаў) у 22 разы. Затое права пяцігадовай арэнды прыбудаванага памяшканьня, што на 2-ім завулку Белуша, было набыта за адносна невялікія грошы - 3,9 мільёна рублёў (стартавая цана - 2 мільёна).

Усяго за выстаўленыя на аўкцыёне аб'екты атрымана 955,9 мільёна рублёў. Ці шмат гэта? Калі ўлічыць, што на папярэднім шэсьць лотаў былі прададзены за 1894 мільёны, то не. Але ж тады амаль усе аб'екты набываліся ва ўласнасьць.

P.S.: Калі нумар рыхтаваўся да друку, стала вядома, што 31 студзеня пройдзе восьмы аўкцыён. На ім плануецца выставіць шэсьць аб'ектаў: кавярню, дзьве харчовых, адну гароднінавую і адну прамтаварную крамы, а таксама кіёск.

СА ЗВЫЧКАЙ ДАВЯДЗЕЦЦА РАЗЬВІТАЦЦА

Жыхары і госьці Горадні страцілі магчымасьць тэлефанаваць бясплатна гарадзкім абанентам з тэлефонаў-аўтаматаў, што бесперашкодна рабілі на працягу прыкладна двух гадоў.

З пачатку студзеня званок можна будзе ажыцьцявіць толькі пры наяўнасьці спецыяльных жэтонаў. Прадаюцца яны ў кіёсках "Белсаюздруку" і аддзяленьнях сувязі. Кошт аднаго складае 72 рублі.

А.ДУК.

ІНФАСЬМЕХ

У КПСС

У КПСС адбыўся раскол: з аднаго боку апынулася партыя, з другога - розум, гонар і сумленьне нашай эпохі.

З ЖЫЦЬЦЯ КРАІНЫ

Краіна перажыла гады Вялікага Пачыну, Вялікага Ўздыму, Вялікага Пераломy, Вялікага Подзьвігу, Вялікай Перамогі, Вялікага Прарыву. Зараз час Вялікага Прыколу.

БУДАЎНІЦТВА

Поўным ходам ідзе будаўніцтва новага грамадзтва - урад робіць разумныя фізіяноміі.

ШТО СТВАРАЕЦЦА Ў НАС?

На Захадзе ідзе стварэньне Агульнаэўрапейскага дома, на Ўсходзе - Эўраазіяцкага дурдома.

ПАТРЭБНЫ ПСІХІЯТРЫ

Ідуць спрэчкі, хто зараз павінен кіраваць дзяржавай: добрыя эканамісты, добрыя палітыкі ці добрыя юрысты. Аднак відавочна, што зараз дзеля гэтага былі б больш карыснымі добрыя псіхіятры.

У ДАРВІНІСТАЎ

Дарвіністы атрымалі новыя доказы паходжаньня чалавека ад малпы, вывучаючы інтэнсіўныя зваротны працэс, што зараз адбываецца ў краінах СНД.

* * *

- Ці шмат зараз харчовых прадуктаў у рэспубліцы?

- Шмат - як валасоў на галаве прэзідэнта.

* * *

- У чым галоўная розьніца паміж доларам і беларускім рублём?

- Долар забясьпечаны золатам, а рубель - абяцанкамі.

(Л.С.)

"ПАГОНЯ"
РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА
Заснавальнік:
культурна-асьветніцкі фонд "БАЦЬКАЎШЧЫНА".
Адрас рэдакцыі: 230023, г.Горадня, вул.Дамініканская, 1.
Тэлефоны: 45-29-96, 45-41-83.
Газета выдаецца па пятніцах 4 разы на месяц.
Пры передруку спасылка абавязкова.
Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест разьмешчанай у газеце рэкламы.
Індэкс 63124. Ліцэнзія № 465.
Фотанабор, афсетны друк.
Гарадзенская абласная ўзбуйненая друкарня: 230003, г.Горадня, вул.Паліграфістаў,4.
Заказ 71.
Наклад 10037 паасобнікаў.